А 9409

Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

КОШТ НУМАРУ 5 кап.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.
Ненумарыраваныя рукапісы назад адтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА:

На 1 месяц	— 90 к.
„ 3 „	2 р. 70 к.
„ 6 „	4 р. — к.
„ 1 год	8 р. — к.
Зьмена адрасу: іншагародняя	— 20 к.
мясцовая	— 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ:

За радок капарэлі пасьля тэксту — р. 50 к.
За радок капарэлі перад тэкстам 1 р. — к.
За радок капарэлі перад тэкстам 1 р. 50 к.
Сямейныя на 50 проц. дарожэй.
Зьмена тэксту бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ:

За 1 дакумент . . . 35 кап.
За кожны дадатковы . . 15 „
Беспрацоўн. і чырвонаармейцы за дакумент . . 15 „
За кожны дадатковы . . 5 „
Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, ва ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і на ўсіх пошт.-тэл. канторах.
АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

9 ГОД ВЫДАНЬНЯ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 253 (2441) Чацьвер, 1-га лістапада 1928 г.

На парозе Кастрычніка.

«Правда» ў перадавіцы „На порога Октября" піша:

11-ая ўгодкі нашае пралетарскае перамогі сьведчаць пра новыя вялікія дасягненьні сацыялістычнага будаўніцтва ў нашым краі. Але, не зважаючы на вялікія дасягненьні, мы, як і раней, павінны перамагаць пры пасоўваньні наперад сур'ёзныя цяжкасьці—цяжкасьці росту.

Пасоўваньне да сацыялізму адбываецца зараз у варунках узмоцненага напору клясавых ворагаў; вось чаму лёзунг ЦК—«Мацней агонь на кулаку, непману, шкоднику і дапамагаючаму ім бюракрату»—павінен стаць адным з кіруючых лёзунгаў нашае далейшае працы. Каб узмацніць асноўную базу сацыялізму, мы павінны галоўную ўвагу аддаць справе індустрыялізацыі краю, справе будаваньня нашае буйнае сацыялістычнае прамысловасьці. „Больш вугалю, нафты, мэталяў і машын"—гэтым лёзунгам рабочая кляса адкажа на ўсе спробы яе ворагаў перашкодзіць сацыялістычнаму будаўніцтву і сарваць тэмп індустрыялізацыі нашага краю.

Індустрыялізацыя краю, справе якое мы аддаём максымальныя сродкі, вымагае ажыцьцёвіць вялікі плян будаўніцтва, павялічыць вытворчасьць працы, узмацніць працоўную дысцыпліну рабочае клясы, рашуча змагацца з разбэшчанасьцю і г. д. Напружанаю працаю і рэвалюцыйнаю дысцыплінаю даможамся мы далейшых рашучых посьпехаў на фронце гаспадарчага развіцьця.

Асаблівую ўвагу павінны выклікаць каксана і патрэбы вёскі. «Уважлівымі адносінамі да патрэб і затрабаваньняў вёскі ўзмацнім сувязь між пралетарыятам і асноўнаю масаю сялянства"—так ставіць пытаньне ЦК партыі, выходзячы з глыбокага ленінскага падыходу да справы ўцягненьня вёскі ў сацыялістычнае будаўніцтва. Цьвёрда прытрымліваючыся таго, што індустрыялізацыя краю ня можа адбывацца [illegible] развіцьця вёскі, мы павінны ў момант 11-х угодак Кастрычніка паставіць вадачу далейшага больш паскоранага развіцьця яе вытворчых сіл на аснове ўзмацненьня сацыялістычнага сэктару вёскі, на аснове будаўніцтва калектыўных і савецкіх гаспадарак, на аснове ўсямернае дапамогі індывідуальнай бядняцка-серадняцкай гаспадарцы ў галіне павялічэньня ўраджайнасьці, палепшаньня справы апрацоўкі зямлі і г. д.

11-ая ўгодкі Кастрычніка супадаюць з узмоцненаю падрыхтоўкаю да перавыбараў саветаў, якія вызначаюцца органамі рабочае дыктатуры. Наша задача—павесьці шырокую агітацыю за далейшае ўмацаваньне і ажыўленьне саветаў, за ўзмацненьне ў іх кіраўніцтва пралетарыяту і камуністычнае партыі, за прыдушэньне клясавых ворагаў і ўдым творчых сіл мас пры саветы. Лёзунг, высунуты нашым ЦК—«няшчадная барацьба забабонасьці, няўважлівасьці, нячулаьці да патрэб пралетарскіх, бядняцкіх і серадняцкіх мас»—павінен стаць адным з галоўных лёзунгаў і ў кампаніі па перавыбарах саветаў і ў дзень сьвяткаваньня 11-х угодак Кастрычніцкае рэвалюцыі.

Мабілізуючы назакол вялікага сьвята ўгодак Кастрычніка шырокія рабочыя і сялянскія масы, мы павінны паглыбіць рабочую самакрытыку, разгарнуць пралетарскую дэмакратыю, яшчэ мацней выступіць на барацьбу проці хвароб у нашых пралетарскіх шэрагах: някультурнасьці, п'янства, рэлігійных забабонаў, антысэмітызму і г. д.

Надыходзячыя новыя вялічэзныя задачы, якія стаяць перад партыяй і краем, вымагаюць адзінства і згуртаванасьці ленінскае партыі. Вось чаму «выразнасьць ленінскае лініі», барацьба проці апартунізму і прымірэнцтва вяўляюцца ў сучасны момант асабліва неабходнымі. Барацьба з усякім апартунізмам, асабліва з правым адкрыта апартуністычным ухілам у партыі павінна непаслабна праводзіцца нашай партыяй.

Выконваючы вялікія заветы Леніна, мы ўжывём усе захады, каб надыходзячы дзень угодак Кастрычніка [illegible] шырэй разгарнуў перад шырокімі масамі асноўныя лёзунгі нашае партыі, згуртоўваючы гэтыя масы навакол камуністычнае партыі, заклікаючы іх пад нашыя баявыя чырвоныя сьцягі для пераможнага будаўніцтва сацыялізму ў нашым краі і ва ўсім сьвеце.

У Саюзе ССР.

Палёгкі настаўнікам аддалённых мясцовасьцяў РСФСР.

МАСКВА, 30-X. У зьвязку з асаблівымі ўмовамі працы настаўнікаў у школах, размешчаных у далёкіх мясцовасьцях, прэзыдыум Усерасейскага ЦВК ухваліў пастановы СНК РСФСР законапраект, які надае апэцыяльныя палёгкі для гэтае катэгорыі настаўнікаў. У адносінах пэрыядычных прыбавак—усе настаўнікі, якія нясупынна працавалі ў аддалённых мясцовасьцях ня менш 3-х гадоў, атрымліваюць адну пэрыядычную прыбаўку да асноўнага акладу заработку; настаўнікі са стажам 6-9 гадоў атрымліваюць 2 прыбаўкі і г. д. У цэнтральных раёнах РСФСР пэрыядычныя прыбаўкі атрымліваюць настаўнікі, якія працавалі ня менш 5-ці гадоў пры савецкай уладзе. Апроч таго, разьмер пэрыядычных прыбавак у мясцовасьцях вельмі аддалённых падвышаецца. Крыху меншыя палёгкі будуць мець настаўнікі, якія працуюць у далёкіх мясцовасьцях.

Нарэшце, прэзыдыум Усерасейскага ЦВК перадаў на зацьверджаньне саюзнага ўраду сваю пастанову, каб кожны год службы працаўнікоў асьветы мясцовасьцяў вельмі аддалённых залічваўся ў стаж працы, як год і 8 месяцаў, а ў мясцовасьцях аддалённых—год і 3 месяцы.

Прыватнік канае.

ХАРКАЎ, 31-X. Прэзыдыум Дзяржаўнае Плянавае Камісіі заслухаў даклад ЦСУ і спэцыяльнае камісіі Дзяржпляну аб прыватным капітале на Украіне. У 1926-27 г. выпуск прадукцыі прыватнае прамысловасьці скараціўся на 56 проц. у параўнаньні з папярэднім годам, у зьвязку з чым удзельная вага прадукцыі прыватнае прамысловасьці ва ўсёй прадукцыі украінскае прамысловасьці вынізіўся з 6,1 да 3,7 проц. Адначасна ўдзельная вага звароту прыватнага гандлю ў агульным звароце ўсяе гандлёвае сыстэмы Украіны вынешнылася з 24,3 да 18,1 проц.

Міліёны гэктараў пад новыя фабрыкі збожжа.

МАСКВА, 30-X. Прэзыдыум Усерасейскага ЦВК перадае пад новыя збожжавыя савецкія гаспадаркі на тэрыторыі РСФСР 2.620.000 гэктараў зямлі. Па раёнах гэтая плошча разьмяркоўваецца так: у Сярэднім Паволжжы будзе вылучана 810.000 гэктараў, Ніжнім Паволжжы—920.000, Паўночным Каўказе—210.000, Сібіру—400.000, Урале—280.000 гэктараў. Наркамзему РСФСР даручана зацьверджаць за новымі савецкімі гаспадаркамі вяменьныя фонды ў гэтых разьмерах.

Сялян на зімні курорт.

ПЯЦІГОРСК, 29-X. У санаторыях Кісловодску прызначана на зімні сэзон 200 месц для сялян.

У камсамоле ня месца зажыму.

Усякае парушэньне ўнутрысаюзнае дэмакратыі павінна знаходзіць рашучы адпор камсамольскае масы і, у першую чаргу, яе рабочага ядра.

Ліст ЦК УсеЛКСМ да ленінградзкае камсамольскае арганізацыі.

МАСКВА, 30-X. ЦК УсеЛКСМ зьвярнуўся да ленінградзкае арганізацыі УсеЛКСМ з лістом аб выніках абсьледаваньня цэнтральна-гарадзкога райкому УсеЛКСМ, якія абмяркоўваліся на райённым актыве, на пленуме ленінградзкага абласнога камітэту і ў бюро ЦКмолу. Гэтыя вынікі падрабязна асьвятляліся і ў нашым друку.

ЦК УсеЛКСМ—зазначана ў лісьце да ленінградзкае арганізацыі—лічыць патрэбным у сьпісной форме даць агульную ацэнку справы ў цэнтральна-гарадзкім раёне. Кіраўніцтва цэнтральна-гарадзкога раёну грунтавалася не на ініцыятыве і самадзейнасьці мас, а на прыдушаньні ўнутрысаюзнае дэмакратыі. Жалезны абруч масавага кантролю зьнізу быў замацаваны іржавым колам кругавое парукі зьверху. Самыя буйныя пралетарскія калектывы былі адхілены ад кіраўніцтва. Абюракрачная верхавіна райкому бачыла ў іх не свае апорныя пункты ў арганізацыі, а небясьпечных сьведак, якіх лепш не дапушчаць на блізкую адлегласьць да райкому. Сацыяльны склад арганізацыі насьпынна пагоршаўся на працягу ўсяго 1927 г. Прыток рабочае моладзі паслабіў. У складзе бюро калектываў па рабочай групе рабочыя зьменшыліся на 10 проц., служачыя павялічыліся на 12 проц. Актыў вымучаўся не на аснове клясавага і дзелавога адбору, а на асновах сямейнасьці, выслужніцтва перад начальствам і паслухмянасьці. Масы і кіруючыя органы ня ведалі праўды, дакучаючы падтасоўцы лічбаў знарок.

Непасрэдныя вінаўнікі, канкрэтныя насьпелі зла зьняты з працы. Але вінны не яны адны. Вінен таксама ленінградзкі абласны камітэт камсамолу, які, каверуючыся казённай інфармацыі быўш. сэкратара райкому Зімы аб поўным дабрабыце, ня толькі ня сьпыніў гэтых злоўживаньняў, але і ня ўжыў своечасна захадаў проці сыстэматычнага пераблытваньня лініі камсамолу, якое практыкавалася ў цэнтральна-гарадзкім раёне. Гайкі кантролю зьверху на гэтым вучастку працы абкому былі пасланблены. Адзначаючы дапушчаную абкомам памылку, ЦК лічыць патрэбным заявіць, што гэтая памылка, пры дапамозе ЦК, выпраўлена абкомам праз цьвёрдае і рашучае правядзеньне ўсіх мерапрыемстваў па аздраўленьні райённага кіраўніцтва.

Вінен райённы партыйны камітэт, які давволіў падмануць сябе кіраўнікам райкому камсамолу і ня чуў тых штурмкоў зьнізу, якія сьведчылі пра нездаволеньне ў масах і ў асноўных рабочых калектывах.

Нарэшце, Цэнтральны Камітэт ні ў якім разе ня можа вызваліць ад адказнасьці за гэта райённую арганізацыю і, у першую чаргу, камсамольцаў асноўных рабочых калектываў. Яны больш усяго адказны за становішча райёну. Яны павінны былі ахапіць зьнізу масавы адпор тым агідным, і пераблытваньням клясавае лініі, якія былі распаўсюджаны ў райёне. Яны павінны былі вытвіць абякрачаных і адарваных ад мас кіраўнікоў, своечасна затрабаваць, каб абласны камітэт і Цэнтральны Камітэт таксама, як і ўся райённая арганізацыя, актыўна і неадкладна ўмяшаліся ў гэтую справу. Толькі пасьля агалошэньня матар'ялу ў друку і назначэньня камісіі абкому, пачала шпарка разгортвацца „сустрэчная хваля самакрытыкі зьнізу", і асноўныя рабочыя калектывы моцна ўзялі ў свае рукі справу перабудовы кіраўніцтва на новых асновах.

Якія-ж вывады трэба зрабіць з усяго зазначанага? Трэба павялічыць адпорнасьць кожнае нізавое арганізацыі і кожнага камсамольца ў адносінах да зўсіх скрыўленьняў і пераблытваньняў кіраўніцтва. Кожная спроба зажыму павінна спаткаць неадкладны арганізаваны і рашучы адпор зьнізу. РАЗГАРНУЦЬ САМАКРЫТЫКУ, ГЭТА ЗНАЧЫЦЬ—ЗАСНАВАЦЬ ЖАЛЕЗНЫ КАНТРОЛЬ ЗЬНІЗУ, ПАВЯЛІЧЫЦЬ АДКАЗНАСЬЦЬ ЗА КІРАЎНІЦТВА. Задачы, якія стаяць перад намі ў зьвязку з разгортваньнем самакрытыкі, ня толькі ў тым сэнсе, каб вылоўліваць і выганяць канкрэтных насіцеляў зла—абюракрачаных і адарваных ад мас кіраўнікоў,—але, перш-на-перш, у тым, каб налепшваць і пераробляць старую сыстэму працы. НОВАЯ СЫСТЭМА, ГЭТА—РАЗГОРНУТАЯ ІНІЦЫЯТЫВА І САМАДЗЕЙНАСЬЦЬ МАС ПЛЮС ЗДОЛЬНАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ ГЭТАЕ ІНІЦЫЯТЫВЫ І САМАДЗЕЙНАСЬЦІ. Ініцыятыўныя групы ўсіх галін зброі (на барацьбе з п'янствам, працы ў ЖАКТА'ах, перабудове інтэрнатаў і г. д.), бытавыя асяродкі, якія ўпяршыню зарадзіліся ў Ленінградзе, вытворчыя пераклічкі,—вось частачка новае сыстэмы.

Больш цьвёрда і адважна разгортваць ормакрытыку. Заснаваць жалезны кантроль зьнізу і зьвязанае з масамі ініцыятыўнае кіраўніцтва. Перабудоўваць сыстэму працы на асновае ініцыятывы і дабрахвотнасьці мас. Узьвышаць ідэёвы ўзровень камсамольцаў—такія галоўныя вывады, якія павінна зрабіць ленінградзкая арганізацыя і ўвесь саюз.

Зразумела, сыстэма пераблытваньняў, якая мела месца ў цэнтральна-гарадзкім раёне пры старым кіраўніцтве, не характарызуе становішча Ленінградзкае арганізацыі ўцэлым. Але справа цэнтральна-гарадзкога раёну вяўляецца для Ленінградзкае арганізацыі, як і для ўсяго саюзу, сур'ёзнаю перасьцярогаю, трывожным сыгналам, да якога трэба прыслухоўвацца.

Зараз у цэнтральна-гарадзкім раёне пры самым актыўным удзеле камсамольскіх мас і, у першую чаргу, камсамольцаў асноўных рабочых калектываў, і пад кіраўніцтвам Ленінградзкага абласнога камітэту УсеЛКСМ адбываецца ліквідацыя апошніх рэшткаў ранейшага кіраўніцтва. Цэнтральны камітэт заяўляе, што Ленінградзкая арганізацыя была і зьяўляецца аднаю з лепшых пралетарскіх арганізацый нашага саюзу, асновою пралетарскага кіраўніцтва ў камсамоле. Цэнтральны камітэт выказвае цьвёрдую ўпэўненасьць, што Ленінградзкая арганізацыя—яе пралетарскі актыў і кіраўніцтва—зможыцца разьвяжуць задачы, узьняўшы магутную хвалю самакрытыкі, і наўхільна будуць ісьці ў першых шэрагах ленінскага камсамолу.

Школу злучым з фабрыкаю.

Заснаваньне вучэбна-вытворчых майстэрняў пры 700-х сямігодках.

МАСКВА, 30-X. Агалошае ліст да ўсіх заводзкіх кіраўніцтваў, фабрычна-заводзкіх і мясцовых камітэтаў і ячэек УсеЛКСМ за подпісамі старшыні ВСНГ СССР Куйбышава, старшыні УЦСПС Томскага і сэкратара ЦК УсеЛКСМ Мільчакова.

Па ініцыятыве камсамолу, у зьвязку з яго 10-мі ўгодкамі—зазначана ў лісьце—з 27-га кастрычніка да 14-га лістапада праводзіцца ўсесаюзны суботнік дапамогі школе. Гэтая ініцыятыва падахопілена прафэсыянальнымі саюзамі і гаспадарчымі ўстановамі. Прэзыдыум ВСНГ СССР, абмяркоўваўшы пытаньні суботніка, ухваліў: „давяраць дырэктарам прадпрыемстваў выдаць дармова вытворчым камісіям на правядзеньні суботніка на заводах і фабрыках старое абсталяваньне, як варштаты, абцугі, маторы і інш. з складзкіх запасаў, сьпісаўшы гэтую маемасьць з балянсу асноўнага капіталу». Гэтая пастанова, поруч з іншымі мерапрыемствамі, наконт суботніка, дае магчымасьць врабіць радыкальны зрух у бок стварэньня фабрычна-заводзкае сямігодкі. Мінімум у 700-х сямігодках пры фабрыках і заводах і ў буйных прамысловых цэнтрах павінны быць заснаваны вучэбна-вытворчыя майстэрні. Фабрычна заводзкія камітэты, заводзкія кіраўніцтвы і камсамольскія ячэйкі павінны з усёй энэргіяй узяцца за ажыцьцяўленьне гэтае пастановы, дапамагаючы вытворчым камісіям падбіраць патрэбную для школы маемасьць, кіруючыся належнай намэнклятурай і спэцыфікацыяй, і своечасна разьмяркоўваць яе праз аддзелы народнае асьветы між 7-мігодкамі.

Пасьля сканчэньня суботніку і адбору вытворчага абсталяваньня ячэйкі камсамолу і фабрычна-заводзкія і мясцовыя камітэты павінны распачаць заснаваньне вучэбна-вытворчых майстэрняў у школах-сямігодках, падпушкаўшы дзеля гэтага належныя памяшканьні, інструктароў і патрэбныя сродкі. Вучэбна-вытворчыя майстэрні павінны заснавацца ў першую чаргу ў тых сямігодках, якія могуць быць праз самы кароткі час рэарганізаваны ў фабрычна-заводзкія сямігодкі праз прыбліжэньне іх да школ фабзавучу.

Татарскі рабфак на Украіне.

СТАЛІН, 26-X. На рудніках Данбасу працуе некалькі тысяч рабочых-татараў, якія ня маюць магчымасьці набыць выпэйшую асьвету з прычыны адсутнасьці спэцыяльных навучальных устаноў для татараў на Украіне. У зьвязку з гэтым, згодна пастановы СНК УССР, у Сталіне пры Данецкім Горным Інстытуце адчыняецца рабочы факультэт на татарскай мове для рабочых-татараў, разьлічаны на 40 чалавек.

ЯШЧЭ АДНА ЗДРАДА НЯМЕЦКІХ РЭФАРМІСТАЎ.

БЭРЛІН, 30-X. Камісія па пытаньнях заработку пры згодніцкім саюзе мэталёўцаў большасьцю 46-ці проці 17-ці галасоў зацьвердзіла трацейскую пастанову аб канфлікце ў Рэйнска-Вэстфальскай цяжкай прамысловасьці пад тэю прычэпкаю, што лёкаут належыць абавязкова адхіліць. Між тым гэтая трацейская пастанова адхілена канфэрэнцыяй службовых асоб саюзу ў такіх галоўных раёнах, як Дортмунд, Эссэн, Бохум і інш. Рэзалюцыя левае меншасьці, аб патрэбе згадзіцца на выклік прадпрыемцаў, ня была дапушчана да галасаваньня. Больш таго, была адхілена прапанова прадстаўнікоў жоўтага саюзу мэталёўцаў паставіць пытаньне аб трацейскай пастанове на рэфэрэндум рабочых.

Карыстаючыся тым, што рэфармісты сабатуюць барацьбу, заводчыкі адмовіліся падначаліцца трацейскай пастанове і намераны абвясьціць лёкаут 31-га кастрычніка.

БАРАЦЬБА „МОКРЫХ" І „СУХІХ" НА АМЭРЫКАНСКІХ ВЫБАРАХ.

НЬЮ-ЁРК, 30-X. Лік выбаршчыкаў, якія зарэгістраваліся для ўдзелу ў дадыходзячых 6-га лістапада прэзыдэнцкіх выбарах, дасягнуў 43 х міл., у той час як пры выбарах у 1924 г. зарэгістравалася толькі 29 міліёнаў выбаршчыкаў.

Такая зацікаўленасьць да выбараў, тлумачыцца тым, што выбарчая барацьба вядзецца галоўным парадкам вакол пытаньня, ці захаваецца забарона сьпірытусовых напіткаў ці будзе яна адменена.

Антысавецкія інтрыгі Англіі ў Скандынавіі.

СТАКГОЛЬМ. Учора ў друку была агалошана тэлеграма з Рыгі, якая зазначала, што пасьля візыту эстонскага прэзыдэнта ў Стакгольм ідэя «ўцягнуць Эстонію і Латвію ў кола паўночнае культуры» набывае ўсё больш канкрэтныя контуры.

Абмяркоўваючы гэтае паведамленьне, сацыял-дэмакратычная газэта «Ні Тыд», якая выходзіць у Гётэборзе, піша: «Вопытны чытач адразу зразумее, што справа ідзе не аб культуры, а аб пра пагандзе. Загад паходзіць таксама ня з Рыгі, а з Гельсінгфорсу і Лёндану. Ужо на працягу некалькіх гадоў ангельскае міністэрства замежных спраў і яго лёкаі нясупынна працуюць над тым, каб зацікавіць «шведзкіх культурных людзей» вьбліжэньнем з Балтыцкімі дзяржавамі. Уся гэтая гісторыя ня мела-б сэнсу, калі-б яна ня ставіла палітычных мэт. Гэтая палітычная мэта ёсьць ня што інакшае, як заснаваньне саюзу, накіраванага проці СССР».

Буйная закупка савецкае нафты

НЕ ЗВАЖАЮЧЫ НА ВОСТРЫЯ ПЕРАШКОДЫ КАНСЭРВАТАРАЎ.

ЛЁНДАН. На пасяджэньні гарадзкое рады Гулю кансэрватар палкоўнік Ольдфільд выступіў проці пастановы рады падпісаць угавор з «РОП'ам» (таварыства па продажу савецкіх нафтапрадуктаў у Англіі) на дастаўку 260 балёнаў бензыны. Ольдфільд заявіў, што пры вырашэньні гэтага пытаньня трэба кіравацца больш важнымі разуменьнямі, чымся магчымасьцю з'эканоміць 400 фунтаў стэрлінгаў. Ён заявіў, што грошы, заплачаныя за газу, будуць „выкарыстаны на наладжаньне рэвалюцыі ў Англіі і калёніях». Гарадзкая рада адхіліла рэзалюцыю, пададзеную Ольдфільдам, і зацьвердзіла ўгавор з «РОП'ам».

Аб'яднацца для адпору забойцам рабочых.

НЬЮ-ЁРК, 30-X. У зьвязку з агалошэньнем у буржуазнай часопісі „Аутлук" новых довадаў поўнае нявіноватасьці пакараных летась сьмерцю Сако і Ванцэці, ЦК камуністычнае «Уокерс Партыі» выпусьціў адозву, у якой заяўле: «Забойства Сако і Ванцэці зьяўляецца злачынствам, у якім вінавата ўся капіталістычная кляса Паўвечна-Амэрыканскіх Злучаных Штатаў».

Адозва заклікае рабочых аб'яднацца ў рэвалюцыйную партыю для барацьбы проці капіталу.

ДЗЕСЯТКІ НОВЫХ АХВЯР ТЭРОРУ ЧАН-КАЙ-ШЫ.

ШАНХАЙ, 28-X. У Кантоне на спыняюцца масавыя арышты, галоўным парадкам, сярод чыгуначнікаў. Водгук паведамленьняў ганконгскіх газэт, за час з 26-га верасьня да 5-га кастрычніка ў Кантоне пакарана сьмерцю жандарамі 68 асоб па абвінавачаньні ў прыналежнасьці да камуністычнае партыі. У гэты лік не ўваходзяць асобы, пакараныя сьмерцю вайсковаю ўладаю. У Ганконзе арыштавана шмат асоб па абвінавачаньні ў тым, што яны ўдзельнічалі ў леташнім кантонскім паўстаньні, а таксама ў тым, што яны былі членамі савецкага ўраду у Хайлёфыне.

ПАПАЎНЕНЬНЕ ЯПОНСКІХ ГАРНІЗОНАЎ У КІТАІ.

ПЕКІН, 30-X. Водгук паведамленьняў японскага агенцтва Ніпон Дэмпо, у Цьянцзін прыехала 150 японскіх пяхотных і 30 артылерыйскіх афіцэраў. Гэтыя афіцэры камандыруюцца з розных часьцей у японскія гарнізоны Пекіну і Цянцзіну.

ЖАХ ГОЛАДУ.

ПЕКІН, 30-X. Міжнародная асацыяцыя падачы дапамогі галадуючым Кітаю завалена ходайніцтвамі, якія наступаюць з усіх канцоў краю. У галадуючых раёнах жыхарства пакідае свае будынкі. Шмат-хто харчуецца карою і лісьцем. Нованароджаных забіваюць, падпіткаў прадаюць.

Задыспутаны сацыял-курылка.

БЭРЛІН, 30-X. Учора адбыўся наладжаны «лігаю правоў чалавека» публічны дыспут на тэму аб «правох чалавека ў СССР». У якасьці дакладчыкаў выступалі, з аднаго боку, эмігрант-меншавік Абрамовіч, а з другога—камуніст Мюнцэнбэрг. Абрамовіч выступаў са звычайнымі паклёпнымі выпадамі па адрасе СССР. Мюнцэнбэрг поўнасьцю адхіліў усе завярэньні Абрамовіча. Гэта вельмі вывяла Абрамовіча, і ў канцы дыспуту ён востра пратэставаў проці наданьня заключнага слова Мюнцэнбэргу, на якое той меў права, як адзін з дакладчыкаў. Прысутныя выказаліся проці Абрамовіча, прычым здарыліся бурныя сцэны. Сход быў зачынен да сканчэньня дыспуту.

У ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ.

Замах на поезд.

Гэтымі днямі невыкрытыя асобы абкідалі каменьнямі асобовы поезд, які ішоў з Баранавіч у Лунінец.

Адломкамі шкла з некалькіх разьбітых шыб паранена 5 асоб.

Арышты ў Навагрудчыне.

„Дзеньнік Віл." (№ 248) паведамляе, што адміністрацыя выкрыла ў Стоўпцах падрайён і дзьве камуністычныя ячэйкі партыі Зах. Беларусі. Цэнтрам іх зьяўлялася м. Ярэмічы, а ячэйкі знаходзіліся ў вёсцы Вялікая Слабада. Арыштавана 14 асоб.

Проці Віл. Бел. Гімназіі.

«Дзеньнік Віл.» (№ 248) сьцьвярджае, што Віл. Бел. Гімназія знаходзіцца пад уплывам «камунізуючых» беларусаў і што вучні гімназіі вырожа адносяцца да польскай дзяржаўнасьці. «Да. В.» вырагае бліжэйшым часам занацца справай беларускіх падручнікаў.

Канфіскацыя „Слова Працы".

Віленскі стараста канфіскаваў № 7 беларускай радыкальнай газэты «Слова Працы» за артыкулы, у якіх знойдзены пракуціні проці 1 арт. загаду прэзыдэнта польскай рэспублікі.

42 гады катаргі.

Віленскі акруговы суд разглядаў гэтымі днямі справу Р. Левіной, Т. Альшванг, Б. Цунермана (студэнтаў Віл. Унів.), Я. Канстанчука, З. Пагоды і Д. Плотніка. Усіх іх абвінавачалі ў прыналежнасьці да КПЗБ і актыўнай камуністычнай дзейнасьці. Левіна была выпушчана пад заклад і на суд не зьявілася. Канстанчук засуджаны на 12 гадоў, Альшванг, Пагода і Цунерман—на 8 гадоў кожны і Плотнік—на 6 гадоў катаргі.

„Студэнцкая думка".

Выйшаў з друку чарговы нумар «Студэнцкай Думкі», органу Віленскага беларускага студэнцтва.

Новая расейская газэта.

31 лістапада г. г. ў Вільні пачне выходзіць новая расейская штодзённая газэта пад назвай „Наша Жизнь". Рэдактарам яе будзе пэйкі Мансураў.

ЖАНДАРСКІ ТЭРОР У ПРЫКАРПАЦКАЙ РУСІ.

АБЛАВА НА... ЛІТАРАТУРУ З СССР.

ПРАГА, 30-X. Орган нацыянал-сацыялістаў «Чэске Слово» паведамляе падрабязнасьці аблавы, наладжанае жандарамі ў горадзе Вялікі Бачкоў у Прыкарпацкай Русі. Аблава тлумачыцца тым, што ўлада хацела зьнішчыць у корані распаўсюджаньне ў Прыкарпацкай Русі кніжак і брашур, друкуемых у СССР, якія, водгук не так прыгранічнае варты, былі прывезены ў Прыкарпацкую Русь двума жыхарамі Вялікага Бачкова. З гэтаю мэтаю атрад у 150 жандараў уступіў у горад і зрабіў вобыск та ўсіх без выключэньня дамох, нікога ня выпушчаючы з гораду. Водгук паведамленьняў жандармэрыі, пры вобысках знойдзена шмат расейскіх і украінскіх кніжак і брашур, выдадзеных у СССР, а таксама „шмат савецкіх сьцягаў". Жандармэрыя нікога ня выпушчала з Вялікага Бачкова ў працягу больш тыдня, чакаючы загаду з Прагі.

ІМПЭРЫЯЛІСТЫ У КІТАІ.

ЯПОНІЯ І КІТАЙ.

За апошнія тры месяцы японская інтэрвэнцыя ў Кітаі разгарнулася ў шырокім маштабе. Інтэрвэнцыя пачалася в Шандуня, адкуль яна незабавам ахапіла ўвесь паўночны Кітай і Манчжурыю. Карэньні сучаснай японскай інтэрвэнцыі маюць сувязь з усёй папярэдняй імпэрыялістычнай палітыкай Японіі ў Кітаі.

Японскі імпэрыялізм пачаў сваю разбойніцкую палітыку ў Кітаі больш як 30 гадоў таму назад. Шпаркае прамысловае разьвіцьцё Японіі было абмежавана недахопам у яе сыр'я і невялікай ёмкасьцю ўнутранага рынку. Японскі капіталізм прымушан быў шукаць рынкаў збыту на сухазем'і і імкнуцца захапіць чужыя тэрыторыі. Кітай і стаў месцам для разьвіцьця маладога японскага імпэрыялізму на сухазем'і.

Пасьля кітайска-японскай вайны 1894 г. Японія захоплівае выспу Фармозу, Ляодунскую паўвыспу і атрымлівае ад Кітая 300 млн. руб. кантрыбуцыі.

Пасьля расейска-японскай вайны 1904-1905 г. г. Японія канчаткова замацоўвае за сабой Паўдневую-Манчжурыю і Карэю.

Праз 10 гадоў, як толькі пачалася апошняя вялікая вайна, Японія, карыстаючыся тым, што ўсе эўрапейскія дзяржавы і ПАЗШтаты былі ўцягнуты ў вайну, становіцца гаспадаром на Далёкім Усходзе. У 1915 г. Японія захоплівае паўвыспу Шандунь, пасьля чаго ставіць Кітаю 21 вымаганьне.

Японія вымагала ад Кітая:

прызнаньня кітайскім урадам усіх дагавораў, якія ў будучыні Японія заключыць з Кітаем на шандуньскаму пытаньню. Гэтым самім Кітай павінен быў санкцыянаваць захват Шандуня;

прыняцьця кітайскім урадам японскіх дарадчыкаў па палітычных і вайсковых пытаньнях.

Кітай абавязваўся даць Японіі цэлы шэраг прывілеяў па эксплёатацыі Манчжуры і Манголіі.

Згода Кітая на гэтыя вымаганьні азначала поўную капітуляцыю яго перад Японіяй.

Паход паўднёвых войск у Паўночны Кітай і разьвіцьцё вайсковых апэрацый зачапіла райён, у якім больш усяго зацікаўлен японскі капітал, бо-ж у адным толькі Паўночным Кітаі ўложана паўтара міліярды рублёў японскіх грошай, тады як па іншых тэрыторыях Кітаю ўложана толькі 500 міліёнаў рублёў.

Выкарыстоўваючы слабасьць сіл Чжан-Цзо-ліна, Японія павялічвае свае гарнізоны ў Манчжурыі. Усё разьгрываецца, як у тэатры. Чжан-Цзо-лін уцякае з Пекіну ў Мукдэн. У Цянь-Цзіне японскі дарадчык Чжан-Цзо-ліна ня рызыкуе далей ехаць з ім і зыходзіць з поезду. Каля Мукдэна, у райёне, які вартавала японскае войска, поезд Чжан-Цзо-ліна быў узарваны. Чжан-Цзо-лін памёр. Па зьмену яму прышоў да ўлады яго сын Чжан-Сюэлян, які, адчуваючы націсканьне з боку японцаў, ідзе ім на ўступкі. Такім чынам, мэта Японіі дасягнена—Манчжурыя апынулася ў цьвёрдых руках японскіх войск, і калі Манчжурыі даводзецца вызваліцца з гэтых рук, ня можна сказаць. Японіі, аднак, мала быць гаспадаром у Манчжурыі.

А між тым, гандлёвы дагавор між Японіяй і Кітаем скончыўся яшчэ ў 1926 г. Нанкінскі ўрад абвесьціў усе старыя дагаворы Кітая з іншымі дзяржавамі скасаванымі і запрапанаваў гэтым дзяржавам, а ў тым ліку і Японіі заключыць новыя дагаворы.

ЗЛУЧАНЫЯ ШТАТЫ І КІТАЙ.

Меншая актыўнасьць амэрыканскага імпэрыялізму ў Кітаі, у параўнаньні з японскім, тлумачыцца тым, што амэрыканскі капітал у Кітаі аналь ні ў дзесяць разоў меншы за японскі. Злучаныя Штаты адыгрываюць у Кітаі троху другую ролю. Яны, напершае, ня маюць у Кітаі ніякіх тэрытарыяльных «інтарэсаў»: у іх няма ні захопленых выспаў «арандаваных» партоў, ні канцэсій. Фінансавыя іх інтарэсы ў параўнаньні з японскімі і ангельскімі таксама невялікія.

У Кітаі працуе ўсяго тры амэрыканскія банкі. Інтарэсы Амэрыкі ў Кітаі гандлёвага характару.

К канцу 19 веку канкурэнты Злучаных Штатаў ужо захапілі ў Кітаі лепшыя кавалкі. Англія захапіла выспу Ганконг, Вэйхайвэй і г. д., Расея—Ляодунскую паўвыспу і інш. Пры такіх абставінах Штатам было выгадней выступіць у ролі абаронцы і прыяцеля Кітая. Абвяшчэньнем прынцыпа «адчыненых дзьвярэй» амэрыканскі капітал дабіваўся роўных з іншымі дзяржавамі магчымасьцяў эксплёатаваць Кітай.

У часе вялікай вайны ўплыў амэрыканскага капіталу ў Кітаі значна аслабеў. Японія была гаспадаром Кітаю. Але, як толькі вайна скончылася, Амэрыка ўзнавіла агрэсыўную палітыку ў Кітаі і адмовілася прызнаць спэцыяльныя японскія інтарэсы ў Кітаі. Амэрыка вышла з вайны настолькі ўзрослай у эканамічным і фінансавым сэнсе, што магла зусім спакойна дыктаваць сваю волю на Далёкім Усходзе. У 1920 г. ам

У ПАНСКАЙ ПОЛЬШЧЫ

Масавыя арышты ў Львове.

АРЫШТАВАНЫЯ—УДЗЕЛЬНІКІ ЗЬЕЗДУ КПЗУ?

ВАРШАВА, 30-X. У зьвязку з масавымі арыштамі ў Львове агалошана паліцэйскае паведамленьне. У ім гаворыцца, што арыштавана 45 чалавек—удзельнікаў зьезду кампартыі Заходняе Украіны. Апрача таго, нібы, выкрыты дзьве нелегальныя друкарні і склад нелегальнае літаратуры, прызначанан да 11-е гадавіны Кастрычнікавае рэвалюцыі. З 45-ці арыштаваных—10 зьняволены ў астрозе і аддадзены пад суд.

Буржуазны друк спрабуе давесьці, што нібы заснавана сувязь між львоўскімі камуністымі і савецкае Украінай.

Відзеўская мануфактура яшчэ бастуе.

ВАРШАВА, 30-X. На Відзеўскай мануфактуры ў Лодзі забастоўка ня скончылася. Рабочыя адмовіліся згадзіцца на новыя стаўкі, выпрацаваныя адміністрацыяй супольна з інспэктарам працы. Лодзінскі карэспандэнт газэты «АБС» паведамляе, што пасьля паражэньня забастоўкі шэрагі ППС левае НПР (пілсудчыкі) у Лодзі пачалі радзець. Рабочыя аднагалосна абвінавачваюць ППС у паражэньні забастоўкі.

Канкурэнцыя між 2-ма ППС у поўным распале.

ВАРШАВА, 30-X. 1-га лістапада, у суседніх гарадох Сасновіцы і Катовіцы, злучаных між сабою трамвайнай лініяй, адбываюцца роўналежныя зьезды абедзьвіх фракцый ППС, якая падзялілася на 2 частні. За ЦК, ці за старую ППС выказалася значная большасьць акруговых арганізацый. За новую ППС, якая называецца цяпер „рэвалюцыйнай фракцыяй", выказалася, апрача варшаўскае арганізацыі, яшчэ некалькі дробных арганізацый цалком і частка Верхня-Сілескае арганізацыі. Становішча ў прафсаюзных арганізацыях Варшавы да гэтае пары ня высьветлена, але старая ППС сьпешна арганізуе ў Варшаве роўналежныя прафсаюзы.

Сярод ППС.

29 кастрычніка г. г. адбыўся сход парляментарнага клюбу ППС. Абгаварвалася пытаньне аб працы ў часе сучаснай сойнавай сэсіі. Потым выбралі 6 дэлегатаў на партыйны зьезд у Сасноўцы, які пачынаецца 1-га лістапада.

На сход не зьявіліся паслы: Явароўскі, Гардэцкі, Шчыпёрскі і Ніскі. Ня высьветлены яшчэ адносіны да клюбу трох паслоў: Смулікоўскага, Пончка і Праўсавай.

8 ЛЕВЫХ МАНДАТАЎ У БОЛЬНІЧНЫХ КАСАХ ТАРНОВА.

ВАРШАВА, 30-X. У Тарнове на выбарах у больнічныя касы левае крыло прафсаюзаў атрымала 8 мандатаў, ППС—14, Бунд—7, пілсудчыкі—25. У ранейшым складзе касы левае крыло ня мела ніводнага прадстаўніка.

Арышт дырэктароў украінскіх кааперэратываў.

У Жулкве арыштаваны два дырэктары „Саюзу украінскіх кааперэратываў" Ілюмэн і Барадык. Іх абвінавачваюць у махінацыях на шкоду для дзяржаўнага скарбу і самаго «Саюзу». Арыштаваных перавезьлі ў Львоў.

Забастоўка яўрэйскіх настаўнікаў.

У Слонімскай яўрэйскай гімназіі выбухнула забастоўка настаўнікаў, якія зажадалі 15 проц. падвышкі платы.

БАРАЦЬБА ГДЫНСКІХ ГРУЗЧЫКАЎ.

ВАРШАВА, 30-X. Забастоўка грузчыкаў у Гдыне (порт у т. зв. польскім калідоры) ня спыняецца. Рабочыя змагаюцца з упартасьцю. Наладзіць працу, з дапамогаю штрэйкбрэхераў, не ўдалося. У порце 13 незагружаных параходаў. Пагрузка вугалю заграніцу не вядзецца.

„Другая лінія акопаў Грамады".

Пад такім загалоўкам чорнасоценны «Дзеньнік Віленскі» (№ 248) зьмясьціў перадавіцу, у якой сіліцца даказаць, што «т-ва Беларускай Школы» зьяўляецца нічым іншым, як «другою лініяй акопаў Грамады» і таму дзейнасьць «Т-ва Бел. Школы» трэба спыніць.

Арышт 2-х камуністаў.

Палітычная паліцыя арыштавала ў Варшаве прахадзіўшых па Тарговай вул. В. Сільчынскага і М. Цукер, якія ў момант затрыманьня іх выкінулі з-пад паліта чырвоны сьцяг з надпісамі: «Вайна імпэрыялістычнай вайне», «Прэч з фашысцкім урадам», «Прэч з акупацыяй Беларусі і Зах. Украіны», «Няхай жыве СССР».

Справа бандыта Рыся.

«Слова» (№ 248) паведамляе, што справа 28 абвінавачаных у прыналежнасьці да банды вядомага бандыта Антона Рыся, слава якога пачалася яшчэ да вялікай вайны, вызначана на 5 студзеня.

У Прэзыдыуме Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР.

27-га кастрычніка 1928 г. пад старшынствам тав. А. Г. Чарнякова адбылося чарговае пасяджэньне Прэзыдыуму ЦВК БССР.

Разам з іншымі разгледжаны наступныя пытаньні:

АБ ДЗЕЙНАСЬЦІ АРШАНСКАГА ГАРАДСКОГА САВЕТУ.

Заслухан даклад Прэзыдыуму Аршанскага Гарсавету і садклад інструктара Арг. Аддзелу Прэзыдыуму ЦВК аб дзейнасьці Аршанскага Гарадзкога Савету.

Уся праца Гарсавету праводзілася на пляну, складзенаму на падставе наказа выбаршчыкаў. Гарадзкі савет сучаснага складу пачаў сваю дзейнасьць з сакавіка мес. 1927 г. Склад Гарадзкога Савету—136 членаў і 46 кандыдатаў, сярод іх жанчын—19,7 проц.

Склад Гарсавету характарызуецца наступнымі лічбамі: рабочых—39 проц., сялян—9 проц., служачых—30 проц.; па партыйнасьці: членаў і кандыдатаў КП(б)Б—53,5 проц., ЛКСМ—7,5 проц. і беспартыйных—39 проц. Пленум Гарсавету скліканца рэгулярна кожны месяц. Наведваньне пасяджэньняў Пленуму было ў сярэднім—70 проц. Пасяджэньні Прэзыдыуму праходзілі рэгулярна і ўся праца праводзілася выключна на пляну. Усіх сэкцый пры гарсавеце—8 (фінансава-бюджэтная, камунальная, асьветы, аховы здароўя, адміністрацыйна-прававая, РСІ, вайсковая, кааперацыйная).

Праца сэкцый праводзілася па пляну, пасяджэньні бюро і пленуму склікаліся рэгулярна. Лепш за ўсяго пастаўлена праца сэкцый: аховы здароўя, кааперацыйнай і камунальнай. Гэтыя тры сэкцыі рэгулярна склікаліся і дзякуючы ўдалому падбору пытаньняў дасягнулі здавальняючую яўку членаў на пасяджэньні. Усе наогул сэкцыі ў большасьці выпадкаў праводзілі свае пасяджэньні на клюбах і прадпрыёмствах.

Прамысловасьць гораду вельмі невялікая і мае чыста мясцовае значэньне. З буйных прадпрыёмстваў гораду можна адзначыць чыгуначныя майстэрні. У прамысловых прадпрыёмствах гораду занята 1095 чалавек. Па пяцігадоваму пляну намечана буйнае разьвіцьцё прамысловасьці. Мясцовая прамысловасьць гораду аб'яднана ў камунальны трэст. У Камунальны Трэст уваходзяць 9 прадпрыёмстваў. Зваротны і асноўны капітал трэсту ўвесь час павялічваецца. Лік рабсілы і вытворчасьць таксама значна ўзрасьлі. Пытаньні жыльёвага будаўніцтва займалі ў працы Гарадзкога Савету вялікую ўвагу. Жыллаапарацыяй, а таксама і калгасам пабудован шэраг новых дамоў. Апрача жылых пабудоў, калгасам вядзецца пабудова: ветлячэбніцы, школы-сямігодкі, будынак для акрпрафсавету і інш. Значная праца праведзена па рамонту дамоў. Школьная сетка ў горадзе складзецца з 13 школ, у якіх навучаецца 3594 дзяцей. Процант ахопу школамі дзяцей школьнага ўзросту складае каля 80 проц.

У справках па дакладу Гарадзкога Савету выказаліся т. т. Файнбург, Масальскі, Барашка, Пятроўская, Хацкевіч, Ігнатоўскі, Варайка.

Прэзыдыум ЦВК арганізаваў пад старшынствам тав. Хацкевіча камісію для распрацоўкі праэкту пастановы па дакладу.

АБ ПАШЫРЭНЬНІ ПРАЎ РЭВІЗІЙНЫХ КАМІСІЙ.

Прэзыдыум ЦВК, у мэтах ажыўленьня дзейнасьці рэвкамісій і ўзмацненьня грамадзкага кантролю над асноўнымі галінамі работы вызвах саветаў, пастанавіў: надаць правы райённым рэвізійным камісіям праверыць выкананьне райённымі выканаўчымі камітэтамі пастаноў райённага зьезду саветаў і рэвізійным камісіям пры сельскіх і местачковых саветах—права праверяць выкананьне саветамі наказаў выбаршчыкаў.

АБ НАДАНЬНІ ТАВ. СЯМЁНАВУ А. К. ГОДНАСЬЦІ ГЭРОЯ ПРАЦЫ.

Прэзыдыум ЦВК БССР пастанавіў надаць годнасьць героя працы тав. Сямёнаву А. К.

Тав. Сямёнаў—земляўпарадкавацель Магілёўскае округі, мае 43 гадовы стаж працы. У час нямецкай акупацыі тав. Сямёнаў захаваў ад драпежніцтва ўсю маемасьць губэрскай чарцёжнай; дзякуючы адданасьці тав. Сямёнава, Савецкая Беларусь атрымала ў поўнай спраўнасьці пляны, архіў і інструменты бюро. Магілёўскай губэрні, якія далі магчымасьць разгарнуць працу па земляўпарадкаванню ў шэрагу округ Беларусі.

НАЗНАЧЭНЬНІ:

Тав. Казюра аслабанен ад абавязкаў Упаўнаважанага НК Замежных Спраў СССР пры СНК БССР.

Тав. Ульянаў назначан Упаўнаважаным НК Замежных Спраў СССР пры СНК БССР.

Тав. Бэргман назначан Упаўнаважаным НК Пошт і Тэлеграфаў СССР пры СНК БССР.

Тав. Захарава назначана Намесьнікам Наркамправы БССР.

Тав. Сасноўскі абран Членам Бюджэтнай Камісіі ЦВК БССР.

Тав. Мінейкі аслабанён ад абавязкаў члена Бюджэтнай Камісіі ЦВК БССР.

ПА БЕЛАРУСКАЙ ССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

Хлебазагатоўкі праходзяць пасьпяхова.

ПОЛАЦАК, 31-X. Па акрузе пасьпяхова праходзяць загатоўкі. З 10 па 20 кастрычніка г. г. загатоўлена жыта 43 з палов. тоны, яравых хлябоў 18 тон., льна-семя 10 тон, валакна $1^{1}/_{10}$ тон. Павялічыліся загатоўкі яравых.

Таксама пасьпяхова ідзе загатоўка сыравіны, у той-жа тэрмін загатоўлена 1364 скур і дробнай сыравіны 1594 шт. скурак.

Слаба праходзіць загатоўка бульбы і малочных прадуктаў.

Памылку прызналі.

Справа аб тым, што Дубровенскі РВК забраў піяніна ад Расасенскай камсамольскай ячэйкі—вядома па ўсяму райёну.

Калі камсамольскія пісулькі абляцелі ўсе вышэйшыя органы ўлады БССР і папалі ў рукі тав. Чарвякову, тады на месца ў в. Расасна выехалі прадстаўнікі РВК у асобе Балтунова і Цаткіна, пагаварыць з камсамольцамі «па душах».

З якім захапленьнем гаварыў т. Цаткін:—«таварышы, нашто вам такая музыка? Хто з вас можа разумець піяніна?—можа адзін-два. Гэта музыка недаступна сялянам. Яна ў вас будзе гінуць, каштоўныя рэчы ў вёсцы заўсёды гінуць, а ў горадзе яны дадуць карысьць! Так і ваша піяніна яна вельмі патрэбна ў Дуброўне».

Салодкія рэчы, але далей яшчэ салодзейшыя паліліся абяцанкі «магчыма, калі знойдуцца сродкі на гэта, мы вам дадзім гармоніку, альбо біб ітоку. Можа РВК аддасьць вам і піяніна, але дайце «абавязацельства», што вы яе адрамантуеце».

Тут на падмогу Цаткіну выступае Балтуноў: «а дзе-ж вы возьмеце столькі сродкаў? Ваша піяніна каштуе 50 р. а за яе рамонт патрабуецца 450 руб. Ня трэба вам ламаць піяніна, калі ў вас яе і ўзялі неправідлова, дык гэтым не зрабілі падрыў савецкай уладзе».

Гэта была гутарка „па душах". Калі нашы прадстаўнікі нагаварыліся, камсамольцы, як адзін, выказаліся за тое, каб РВК зноў паставіў піяніна на месца!

Калі РВК за ўсё лета непадумаўся, што вясковай ячэйцы шмат чаго патрэбна, што трэба было-б што небудзь даць узамен піяніна, дык цяпер, нечага карміць абяцанкамі! Тым болей, што піяніна—наш падарунак і мы будзем патрабаваць яго звароту.

Камсамолка.

(Дуброўна, Аршанскае округі).

Асушаем балоты.

Па райёну лічыцца 21 мэліяратыўнае таварыства. Незарэгістравана—2, адно Заска-Перасадзкае, дзе праводзіцца ізысканьне з мэтай выяўленьня тэхнічнай магчымасьці асушэньня, другое—Праходзкае знаходзіцца ў стадыі арганізацыі.

Таварыствы гэтыя ахопліваюць 1371 гэкт. плошчы, з якой: надзельнай—407 гэкт., а дзяржфонду—967 гэктараў.

Намечана было да асушэньня 186 гэкт., асушана 126 гэкт., што складае 65 проц.

Апрача гэтага, падрыхтован вадапрыёмнік на 200 гэкт. Гэта зьверх пляну.

На зямельныя работы ў 1928 годзе затрачана 1888 гадзін-дзён на суму 4044 руб.

Адносна скарыстаньня крэдытаў становішча больш нармальнае, чым было раней.

У будучым 1929 годзе будзе асушана каля 1000 гэктараў забалочанае плошчы.

Барысаўшчына.

Арганізавалі дэлегацкі сход.

Варша, 30-X. Нядаўна ў вёсцы Сілідчаны, Чэрэйскага райёну адбыўся агульны сход жанчын.

Кіраўніца працай сярод жанчын тав. Калібанава зрабіла гуртку даклад аб дэлегацкіх сходах і ўдзеле ў іх жанчын.

На першы погляд здавалася, што на сход ніхто не зьбярэцца, бо вёска цёмная, жанчыны ў ёй таксама адсталыя.

Але выйшла наадварот. Сялянкі жанчыны з прыемнасьцю спаткалі добрае пачынаньне і з радасьцю віталі Калібанаву дзякуючы сав. уладу за тое, што яна ім адучыць вочы.

Сялянкі вынесьлі пастанову запісацца ўсім у дэлегаткі, расцвачаць працу, зьвязацца з сельсаветам і рыйвыканкомам.

У шэрагі дэлегатак уступіла 29 сялянак.

ПАЧЫНІЛІ МАСТЫ І ДАРОГІ.

(Крайскі сельсавет, Плешчаніцкага райёну).

Доўгі час масты ў райёне Крайскага сельсавету былі ў занапалым становішчы; неаднакраць яны былі прычынай гарачых спрэчак у часы сходак па тых ці іншых пытаньнях.

Прышло самаабкладаньне; сяляне пачалі ўсюды высоўваць прапановы паправіць масты, а ў некаторых мясцох і дарогі.

Зараз зроблена каля 5-6 умоў на пабудову новых мастоў; некалькі мастоў ужо зроблена.

Сяляне з задавальненьнем глядзяць на добрыя вынікі ад самаабкладаньня.

Т-ро.

ТРЫ ФАКТЫ ПРАТЭКЦЫЯНІЗМУ.

Упаўнаважаны Белдзяржбуду абыйшоў Аршанскую біржу працы і «устроіў» свайго брата, прыехаўшага з Віцебску, на работу пры асінаўскім будаўніцтве.

Старшыня рабочкому будаўнікоў «устроіў» у кантору Белдзяржбуду сваю залоўку. Якімсь невядомым шляхам, пры чыёйсьці дапамозе на працу табельнічыка пралез вядомы кулак.

Ці недастаткова гэтых фактаў, каб РСІ зацікавілася такімі балючымі недахопамі пры нашай рабоце, як пратэкцыянізм на будаўніцтве асінаўскай электрастанцыі.

На пабудове нашай буйнай электрастанцыі не павінна быць аніякіх злоўжываньняў.

В.

Выдрыца.

Раўняйцеся па вёсцы Ананчыцы!

60 процантаў звыш заданьня.

Вёска Ананчыцы, Старобінскага райёну з пазыкамі раўняецца па гораду.

Сто процантаў звыш заданьня мы маем па пазыцы ўзмацненьня сялянскай гаспадаркі і 60 процантаў па другой пазыцы індустрыялізацыі краіны. Сялянства ахвотна купляла пазыкі і таму, што на практычных прыкладах растлумачэньня яно зразумела іх значэньне для пралетарскае дзяржавы.

Адным нездаволена было сялянства—мала часу на распаўсюджваньне.

«Зараз, маючы адтэрміноўку да першага сьнежня, мы і самі падкупім і суседзям будзем раіць»,—кажуць сяляне.

Да 1-га сьнежня падвоім дадзенае нам заданьне.

Бабруйск.

Плян кантрактацыі выкананы на 229 проц.

Барысаў, 31-X. У вясенняю насеўную кампанію плян кантрактацыі быў выкананы па 85 проц.

Закантрактавана было: лёну валакна—61,50 гэктараў, семя—37,25 гэктараў, бульбы—44,75 гэкт., ячменю нас.—68,25 гэкт., лубіну—41,90 гэкт., канюшыны—1,0 гэктараў.

У асенняю кампанію закантрактавана азімага жыта—343 гэкт., з іх 145 гэкт. у калгасах і 198 гэкт. у насельніцтва.

Плян асеньняй кампаніі выкананы на 229 процантаў.

ПЕРАХОДЗІМ НА ШМАТПОЛЬЛЕ.

БАРЫСАЎ, 31-X. Па Барысаўскаму райёну пераведзена на шматпольле—2604 гэктараў зямлі.

На шматпольле перайшлі 53 гаспадаркі.

У сучасны момант праводзіцца праца замляўпарадкаваньня 2455 гэктараў плошчы сялянскае зямлі.

Актыўнасьць рабочых аздаравіла гаспадарку.

(Савецкая гаспадарка «Боркі», Чырвона-Слабодзкага р., Бабруйскай акр.).

Рабочыя савецкай гаспадаркі «Боркі», Бабруйскай округі, падзяліліся на дзьве групы: адна на чале з кіраўніком савецкай гаспадаркі Лянкевічам, другая—на чале з старшым рабочым Янушкевічам.

Пачалася барацьба. Рабочыя з групы Янушкевіча бачаць усю безгаспадарчасьць, нядбайства і злачынствы кіраўніка савецкай гаспадаркі „Боркі" Лянкевіча. Скардзяцца ў некаторыя ніжэйшыя прафсаюзныя органы, але нічога не памагае. Бачыце, што можа рабіць Слуцкі райком саюзу сельгаслесрабочых, калі ён ня ўпэўнен у праўдзівасьці заяўленьняў рабочых? Што ён можа рабіць, калі „аўтарытэтная" асоба—загадчык гаспадаркі Лянкевіч—кажа, што ўсё гэта выдумкі, няпраўда? Райком бясьсільны.

А „выдумкі" рабочых вось якія:

Сваім прыхільнікам Лянкевіч дае розныя палёгкі ў працы, вызначае на лягчэйшую працу, павышае разрады і інш. Дарма гэтага Лянкевіч ня робіць. Ня дзіва, што ў колькасьць прыхільнікаў Лянкевіча папалі кабеты М. Мілеўская і В. Прыхач. Да жанчын Лянкевіч адчувае нейкую асаблівую цягу, бо нават жонак і то мае 3.

У пагоне за жанчынамі, Лянкевіч забывае пра гаспадарку. Яна церпіць безгаспадарчасьць, непатрэбныя і нерацыянальныя выдаткі, ідзе да поўнага развалу. Замест таго, каб гаспадарка была добрым прыкладам для ваколічнага сялянства, папулярызавала гаспадарку, як савецкую, новую, гаспадарка вядзецца вусім дрэнна і ідзе да відавочнай катастрофы.

Ня ў тым яшчэ злачынства Лянкевіча, што гаспадарыў ён насуменна і з гаспадарчага боку стратна і праступна. Злачынства Лянкевіча ў тым, што ўсё гэта рабілася сьвядома. Групу рабочых, сваіх прыхільнікаў, Лянкевіч навучыў гаварыць на выпадак дапросаў.

— Кажуце, што Янушкевіч, Дойня і іншыя рабочыя хочуць спіхнуць мяне (Лянкевіча).

Вечная склока і сваркі рабочых в адміністрацыяй нірвав разьбіраліся на агульных сходах з удзелам прафсаюзных арганізацый, якія нічога ў гэтай справе не рабілі. «Наўжаўчывыя» рабочыя перакідваліся з адной гаспадаркі ў другую.

Ваколічнае сялянства неавідзіць Лянкевіча, на кожным кроку высьмейвае яго спосабы вядзеньня гаспадаркі.

Як Лянкевіч выкарыстоўваў сродкі, відаць з наступнага:

Павялічаны (замест скарачэньня) накладныя выдаткі на ўтрыманьне адміністрацыі на 2,5 проц. Гэта, бачыце, таму, што кіраўнік савецкай гаспадаркі выпісваў сабе пэнсію замест 112-119 руб. у месяц ды разьяжджаў сам і камандураваў сваіх прыхільнікаў у розныя непатрэбныя гаспадарчы месцы.

Запазычанасьць гаспадаркі «Боркі» дасягнула вялікай сумы: страхкасе, саюзу, рабочым, крэдытным т-вам, розным асобам, Белсельтрасту і інш. Савецкая гаспадарка „Боркі" мае завінавачанасьць звыш 9.000 рублёў.

Адным словам, поўная безгаспадарчасьць і разгільдзяйства.

Мы не пералічылі тут 1 паловы таго, што рабілася ў савецкай гаспадарцы «Боркі»—няма сэнсу пералічваць. Даволі і гэтага, каб справу Лянкевіча разабраў суд і пакараў яго без усякае літасьці.

Лянкевіч з пасады зьняты, але, паўтараем, гэтага яму мала.

С. Азерокі.

Беларуская Акадэмія Навук і яе мэтад работы.

Вялікі Кастрычнік выклікаў да жыцьця сілы, недаступныя ўладзе капіталу. Разбурыўшы буржуазны парадак, пралетарская рэвалюцыя расчыніла шырокія перспэктывы для сацыялістычнае перабудовы грамадзкага ладу і разам з іншымі праблемамі сацыяльнага парадку развязала і нацыянальнае пытаньне.

І савецкая ўлада творыць цуды, уваскрашаючы народы, даючы нябывалы размах і тэмп разьвіцьця ва ўсіх галінах дзяржаўнага, гаспадарчага і культурнага жыцьця.

У гэтым вялікім ланцугу падзей сацыялістычнага будаўніцтва асабліва яркім зьявіном зьяўляецца разьвіцьцё нацыянальных культур, а ў тым ліку беларускай культуры і беларускай дзяржаўнасьці.

Дзесяць год назад—народ без свайго ўласнага імя, дзесяць год назад—Беларусь—безформная этнаграфічная маса, самая бедная, самая цёмная і нават у тэй юдолі страшнай цемнаты і беднасьці, якою была царская Расія. І вось гэты народ, выкасаваны з кнігі жывых і пахаваны буржуазнымі вучонымі, воляю рабочае клясы абуджаецца да жыцьця, стварае сваю пісьменнасьць, сваю літаратуру, школу, навуку, сваю дзяржаўнасьць і, нарэшце, вянчае сваё культурны росквіт, сваё культурнае будаўніцтва вянком сталай культурнасьці—Акадэміяй Навук.

Беларуская дзяржаўнасьць, беларуская культура і навука створаны воляю працоўных мас, воляю рабочае ўлады ў рэзультаце пралетарскай рэвалюцыі.

Пралетарская рэвалюцыя адбылася з пачыну і пад кіраўніцтвам камуністычнае партыі. Дзейнасьць сваю камуністычная партыя будуе на аснове марксызму, на прынцыпах дыялектычнага матэрыялізму. Чарпаючы сілы ў пралетарскіх масах, у рабочай клясе,—камуністычная партыя здабывае свае веды для дзяржаўнага кіраўніцтва і для сацыялістычнага будаўніцтва і мэтадам гістарычнага матэрыялізму, у тэорыі рэвалюцыйнага марксызму, створанай тварцом навуковага сацыялізму К.Марксам і яго вялікім пасьлядоўцам Ленінам.

Тэорыя гістарычнага матэрыялізму, або матэрыялістычнае разуменьне сацыяльнага жыцьця зьяўляецца самым вострым начыньнем чалавечае мысьлі і пазнаньня. Тэорыя дыялектычнага матэрыялізму памагае разьбірацца ў самых заблутаных пытаньнях грамадзкага жыцьця і клясавай барацьбы.

Да адкрыцьця Марксам матэрыялістычнага сьветапагляду ўсе падзеі гістарычнага і грамадзкага жыцьця аб'яснялися разьвіцьцём чалавечаскага розуму, а то проста воляю невядомае „вышэйшае сілы", здарэньнем, прыпадковасьцю або ўласьцівасьцю тае ці іншае расы або нацыі. Гэта так званае ідэялістычнае сьветаразуменьне, уласьцівае кожнаму буржуазнаму ладу і буржуазнай навуцы.

Беларуская Акадэмія Навук закладзецца савецкаю ўладаю для навуковага, прычым матэрыялістычнага, марксысцкага вывучэньня тых шляхоў і пуцявін, якімі павінна ісьці сацыялістычнае будаўніцтва Беларусі—яе індустрыялізацыя, прамысловасьць, сельская гаспадарка. Гэтым Беларуская Акадэмія адразу цесна зьвязваецца з практычным, штодзённым жыцьцём і ў сваёй рабоце, у навуковай распрацоўцы задач беларускай культуры—беларускай эканомікі, гісторыі, мовы, сельскай гаспадаркі і іншых галін навукі,—мусіць кіравацца адзіным мэтадам—мэтадам дыялектычнага матэрыялізму, марксысцкім сьветапоглядам, які прывёў рабочую клясу да ўлады, а беларускую культуру і беларускую навуку—да жыцьця і росквіту.

Работа яе іншай і быць ня можа. Толькі ў сьвятле гістарычнага матэрыялізму, на аснове марксызму яна зможа прадукцыйна разьвівацца і служыць інтарэсам працоўных мас. Не прызнаючы рабочага сьветапагляду, нельга служыць і рабочым інтарэсам, як не прызнаючы беларускай культуры, нельга разьвіваць гэтую культуру.

Возьмем хоць-бы такую дысцыпліну, як дасьледваньне і навуковая распрацоўка беларускае мовы. Вакол беларускае мовы, як і вакол беларускае гісторыі, буржуазная расійская і польская навука пенаплятала такога павуціньня і „навуковага" разважаньня, што абвергнуць і зьнічыць усё гэта патрапіць толькі досьлед, узброены «самым вострым начыньнем чалавечае мысьлі і пазнаньня»—мэтадам дыялектычнага матэрыялізму.

Мова, як і кожная інтэлектуальная творчасьць, базуецца на эканамічных узаемаадносінах людзей, а раз эканамічныя ўзаемаадносіны рэгулююцца эканамічнымі законамі разьвіцьця, значыць і моўныя факты нараджаюцца, растуць і зьмяняюцца паводле агульных законаў гістарычнага поступу.

Што моўныя факты падпарадкаваны пэўным і цьвёрдым законам, гэта ўстанаўляе і буржуазная лінгвістычная навука. Але буржуазная навука, разглядаючы гісторыю чалавечае культуры, а, значыць, і гісторыю кожнае мовы, праз прызму свайго ідэялістычнага сьветаразуменьня ня бачыць асноўных прычын гэтых законаў, заложаных у дыялектыцы чалавечага прагрэсу,—у той дыялектыцы чалавечае гісторыі, якая з канечнай няўхільнасьцю вядзе да зьнішчэньня як буржуазнага, капіталістычнага ладу, так і яго ідэялёгічнага апраўданьня.

Пра іншыя навуковыя дысцыпліны, як гісторыя, літаратура, мастацтва—і гаварыць ня прыходзіцца. Там дыялектычны мэтад пасьпеў выпрабавацца, замацавацца і даць багацейшыя рэзультаты. Каму, напрыклад, невядомы ўзорны вынік марксыстскага мэтаду, як манумэнтальная праца М. Пакроўскага „История России с древнейших времен?"..

Беларуская культура—культура працоўных мас спачатку свайго зараджэньня. Яна ня зьвязана традыцыйнасьцю з буржуазнаю культураю, бо і само зьяўленьне яе выклікана абуджэньнем тых грамадзкіх сіл, якія прывялі да зьнішчэньня ў нас як буржуазнага парадку, так і яе сьветапагляду. Ня дзіва, што і дагэтуль людзі, пранятыя буржуазным спосабам мысьленьня і буржуазнымі паглядамі на гістарычныя падзеі, не прызнаюць і ня хочуць прызнаць ні беларускай мовы, ні беларускай культуры.

Рабоча-сялянскі характар беларускай культуры дае нам гарантыю ў тым, што навуковая дзейнасьць Беларускае Акадэміі Навук будзе пастаўлена на пралетарскі грунт і пойдзе наперад без неўласьцівых нашай культуры буржуазных ухілаў. Выгадаваная ў рэзультаце пралетарскай перамогі пры бявупынным падтрыманьні савецкаеўлады, беларуская культура будзе нацыянальнай і беларускай толькі ў сваім афармленьні, у спосабах свайго выяўленьня, будучы пралетарскай у сваім зьмесьцё і рэвалюцыйнай сваімі дасягненьнямі.

Няхай-жа квітнее Беларуская Акадэмія Навук і няхай бачаць нашыя браты за рубяжом, як расьце і красуе культурнае жыцьцё ў ССС Рэспублік пад кіраўніцтвам камуністычнае партыі, правільнасьць палітычнага і культурнага правадырства якой пацьвярджаецца ўсё новымі і новымі фактамі.

Язэп Лёсік.

30-X—28 г.

РЭЗАЛЮЦЫЯ СХОДУ НАВУКОВАЎ НІКОЎ г. МЕНСКУ АБ ЗАСНАВАНЬНІ РУСКАЙ АКАДЭМІІ НАВУК.

(ПА ДАКЛАДУ Н. НЕКРАШЭВІЧА).

За 10 гадоў свайго існаваньня Беларуская Савецкая Рэспубліка мае на фронце сацыялістычнага будаўніцтва нашай краіны надзвычайна вялікія даасягненьні. У прыватнасьці на фронце навукі напружанай волай пралетарыяту БССР, літаральна з нічога, арганізавана і шырока разгорнута навукова-дасьледчая праца. Зараз у справе вывучэньня Беларусі працуе нелькі навукова-дасьледчых устаноў; моцны калектыў беларускіх вучоных праводзіць шырокую навукова-дасьледчую працу, ахапляючы ёю ўсе важнейшыя моманты сацыялістычнага будаўніцтва БССР. Завяршэньнем арганізацыйнага будаўніцтва навукова-дасьледчай працы Беларусі зьяўляецца акт аб заснаваньні Беларускай Акадэміі Навук.

Адзначаючы вялікае культурна-гістарычнае значэньне гэтага акту, агульны сход навуковых працаўнікоў г. Менску разам з тым канстатуе яго своечасовасьць, бо шырока разгорнутая праца інбелкульту і іншых навукова-дасьледчых устаноў, у мэтах отрогага яе плянаваньня і далейшага паглыбленьня, настойна вымагала заснаваньня такой навуковай установы, якая-б змагла аб'яднаць і канцэнтраваць усю навукова-дасьледчую працу БССР і згуртаваць навакол сябе ўсе навуковыя сілы Рэспублікі, якія функцыі ад гэтага часу і бярэ на сябе Беларуская Акадэмія Навук.

Вітаючы акт аб заснаваньні Акадэміі Навук, навуковыя працаўнікі БССР знаходзяць, што Беларуская Акадэмія Навук, як Савецкая Акадэмія, павінна мець і адпаведны напрамак у сваёй навукова-дасьледчай працы. Нічым ня розьнічыся па глыбіні дасьледваньня ад іншых акадэмій навук, Беларуская Акадэмія мусіць, аднак, у аснову сваёй дасьледчай працы палажыць маркысцкі мэтад, каб такім чынам, апошні праскваў усю навукова-дасьледчую працу нашай Акадэміі. Сродкам отрогага правядзеньня маркысцкага мэтаду ў працы Акадэміі павінна зьявіцца заснаваньне ў яе складзе адпаведных катэдраў у галіне вывучэньня пытаньняў маркызму і ленінізму, праз што Беларуская Акадэмія Навук зробіцца актыўнай удзельніцай сацыялістычнага будаўніцтва, працярэбліваючы шляхі да лепшай будучыны нашай краіны.

Стоячы ў авангардзе сацыялістычнага будаўніцтва, наша Акадэмія не павінна адрывацца ад жыцьця, а, наадварот, самы цесным парадкам зьвязвацца з ім. Розначыся па сваёй істоце ад буржуазных заходня-эўрапейскіх схалястычных акадэмій, Беларуская Акадэмія ў сваёй арганізацыі мусіць отрога адпавядаць усім вымаганьням сучаснасьці. Пытаньні тэорыі і практыкі ў працы нашай Акадэміі павінны знайсьці адно суцэльнае вырашэньне.

Адзначаючы тым-жа жыцьцёвым запатрабаваньням, Беларуская Акадэмія Навук павінна ўцягнуць і аб'яднаць навакол сябе ўсе актыўныя сілы савецкіх навуковых працаўнікоў і наогул усіх дасьледчыкаў Беларусі, цесна зьвязаўшыся праз іх з шырокімі рабоча-сялянскімі масамі Рэспублікі.

З другога боку, паколькі ў аснову сацыялістычнага будаўніцтва кладзецца прынцып індустрыялізацыі краіны, патрэбна, каб навукова-дасьледчая праца ў галіне вывучэньня гаспадаркі, эканомікі і прамысловасьці БССР знайшла ў структуры нашай Акадэміі і сваю належную пастаноўку.

Навуковыя працаўнікі ўпэўнены, што пабудаваная на такіх прынцыпах Беларуская Акадэмія Навук у поўнай меры адпавядае тыя надзеі, якія ўскладаюцца на яе працоўнымі масамі Беларусі, і зьявіцца тым маяком, які будзе вяка асьвятляць пуцінны разьвіцьця беларускай культуры і іншых нацыянальнасьцяў БССР.

Факт заснаваньня Беларускай Акадэміі Навук будзе красамоўна гаварыць усяму сьвету, што толькі пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі савецкая ўлада, адна ўлада ў сьвеце, шчыра дае неабмежаваныя магчымасьці культурнага разьвіцьця кожнай нацыі.

З свайго боку мы, навуковыя працаўнікі БССР, абяцаем, што прыложым усе свае сілы для выкананьня тых шырокіх заданьняў, якія стаяць перад Беларускай Акадэміяй Навук.

Vivat Academia!

АД ІМЯ АГУЛЬНАГА СХОДУ ЦЭНТРАЛЬНАЕ БЮРО СЭКЦЫІ НАВ. ПРАЦАЎНІКОЎ.

Выстаўка харчаваньня ў Бэрліне*)

(УРАЖАНЬНІ ЎДЗЕЛЬНІКА).

Тэхніка ў харчаваньні і харчовай прамысловасьці.

Тэхнічная выстаўка зьмяшчалася ў асаблівым вялікім павільёне. Тэхніку ў харчаваньні і харчавой прамысловасьці можна было бачыць і ў іншых павільёнах, але не ў такой колькасьці, як тут. Гэты павільён, апрача выстаўкі абсталяваньня для індывідуальнага і масавага харчаваньня, зьмяшчаў розныя машыны і прылады, што ўжываюцца ў харчавой прамысловасьці і нават поўнае абсталяваньне розных харчавых прадпрыёмстваў з поўным ходам іх. Шум, які ахапляў трапляючага сюды гледача, рабіў уражаньне, што пападаеш на нейкі вялікі завод ці фабрыку.

Гэта выстаўка складалася пераважна з паасобных выставак цэлага шэрагу розных нямецкіх фірм і двух невялікіх аддзелаў—Галяндзкага і Нідэрляндзкага.

Тут былі выстаўлены ня толькі паасобныя рэчы, але нават цалкам абсталёваныя кухні і сталовыя, зьвязаныя з агульным плянам кватэры і камунальным яе абслугоўваньнем: апал, вадазабясьпека і інш. Як у паасобных рэчах абсталяваньня, так і ў агульным абсталяваньні было відаць нямецкую акуратнасьць, эканомію часу, сродкаў і сілы, захаваньне пры рацыянальна абсталяванай кухні санітарнага дабрабыту кватэры і г. д.

У асноўным абсталяваная нямецкая кухня мае наступны выгляд: шафа з вэнтыляцыяй у знадворнай сьцяне для хавань

РЫХТУЕМСЯ ДА ПЕРАВЫБАРАЎ САВЕТАЎ.

ЗА БЯДНЯЦКА-СЕРАДНЯЦКІ САЮЗ СУПРОЦЬ КУЛАКА.

Як ідзе падрыхтоўка да перавыбараў.

ПРАЦА РАЗГАРНУЛАСЯ.

Для праверкі падрыхтоўчай працы па перавыбарах сельсаветаў прэзыдыум райвыканкама выканаўчага камітэту склаў [illegible] ліхтоўчую працу перавыбараў с.-с. Камісія прыступіла да працы і ўжо [illegible] агляд Ясеньскага с.-с. У часе [illegible] выяўлена наступнае: адсутні[illegible]ньне усялякай актыўнасьці сяброў с-с. гэтага складу, з 14 сяброў с.-с. працуе толькі 2 сябры, ня лічачы старшыні с-с., астатнія ніякай працы не вядуць; тлумачыцца гэта тым, што 99 проц. сяброў савету паходзяць з заможнай часткі сялянства, якія не жадаюць прыняць удзел у працы с.-с. і наогул у савецкім будаўніцтве, а зацікаўлены скарыстаць сваё становішча —як сябра савета—на паляпшэньне сваёй гаспадаркі.

Таксама камісіяй заўважана, што ўстановы, якія знаходзяцца на абшарах Ясеньскага с.-с., ня цесна зьвязаны з віруючай галоўкай с.-с. Загадчыкі некаторых устаноў (пошта, мэдыцын. і вэт. пункты) бюракратычна адносяцца да наведнікаў, дзякуючы чаму ёсьць незадаволеньне з боку насельніцтва.

Райённы выканаўчы камітэт зрабіў справаздачу перад выбаршчыкамі ў в. Ясеня аб працы РВК за справаздачны перыяд. Агульны сход грамадзян даў шмат дзелавых дырэктыў у далейшай працы, у асаблівасьці паляпшэньня абслугоўваньня вэтэрынар. і мэдыцын. дапамогай і паляпшэньня эканамічнага становішча сельскай гаспадаркі, неабходна адзначыць, што актыўнасьць сялянства маецца вялікая, але трэба гэту актыўнасьць умела і своечасова скарыстаць.

У падрыхтоўчую кампанію патрэбна прыцягнуць усю грамадзянскую думку, у асаблівасьці ўвесь вясковы актыў.

Меней бюракратычных адносін да сялянства, шырэй адчыняць дзьверы працоўнану, не застаўляць яго чакаць на гадзіне на дваре і г. д.

Толькі пры вышчэньні гэтых недахопаў і прыцягненьні да гэтай працы ўсёй грамадзкасьці і ўсяго вясковага актыву мы здолеем выканаць тыя дырэктывы, якія намеціла камуністычная партыя і савецкая ўлада ў часе перавыбарчай кампаніі.

Асіпавіцкі р. Храмянкоў.

У Шклове распачалі падрыхтоўку.

(Магілеўшчына).

5-га кастрычніка ўтворана райённая выбарчая камісія.

У камісію ўвайшло 9 чалавек, з іх 2 жанчыны (адна з жанчын—работніца папяровае фабрыкі «Спартак»).

На апошнім пасяджэньні камісіі абгаварваліся пытаньні, датычныя справаздачнай і выбарчай кампаніі.

Усім селсаветам прапанавана скласьці адпаведныя камісіі.

На мясцох, да пачатку справаздачнае кампаніі, будуць праведзены сходы жанчын.

Растлумачальная кампанія па перавыборах распачалася ўжо як у горадзе, так і па вёсках.

Пытаньні аб падрыхтоўцы да перавыбараў ставіліся на пленуме райвыканкому і гарсавету.

Увесь райён падзелен зараз на 109 справаздачных выбарчых вучасткаў, з якіх у самым горадзе Шклове—9. 1 вучастак—нацыянальны.

Там, дзе ёсьць нацыянальныя меншасьці, даклады будуць рабіцца на іх роднай мове. Д—ны.

Бедната—за працаздольны сельсавет.

На агульным сходзе сялян Махіроўскага сельсавету (Полацкі райён), на якім прысутнічала больш 100 беднякоў, прадстаўнік АК КПБ зрабіў даклад аб падыходзячай справаздачнай і перавыбарчай кампаніі сельсаветаў. Сяляне дакладам былі вельмі зацікаўлены.

— Гэтакі даклад вельмі каштоўны, да перавыбараў мы адносімся сурёзна,—гаварылі беднякі, выступаючы ў спрэчках. У аднагалосна прынятай па докладу рэзалюцыі, паміж іншым, сход сказаў: «мы абяцаем камуністычнай партыі ўсебакова і крытычна праверыць на справаздачных сходах працу сельсавета, абраць у савет працаздольных сумленных таварышоў і даць належны адпор усялякім вылазкам варожага бяднякам-серадняцкаму сялянству элементу».

Я.

Падрыхтоўка да перавыбараў распачалася.

(Рагачоўскі р., Бабруйшчына).

Адбылося пасяджэньне РВК, на якім выдзелена райённая камісія на перавыборах с.-с. Да кожнага с.-с. прыкацаван член РВК, або райкома КП(б)Б, пад кіраўніцтвам якога і будзе праводзіцца падрыхтоўчая праца і самыя перавыбары. Выезды ў с.-с. прымацаваных таварышоў распачаліся з 25 кастрычніка. На мясцох будуць складацца сельскія камісіі па перавыборах, старшыні якіх райвыканкомам ужо зацьверджаны. Справаздачная кампанія с.-с. пачнецца з 15 лістапада, у найбольш буйных населеных пунктах будуць вытвараца справаздачы РВК і іншых райённых устаноў. Своечасовая падрыхтоўка забясьпечыць магчымасьць падабраць у с.-с. лепшы актыў з бяднякоў-серадняцкіх пластоў.

Я. Крушына.

Пастановы гарсавету ня выконваюцца.

Не за гарамі перавыбары саветаў, калі рабочыя і сяляне навінны пачуць поўную справаздачу сваіх дэпутатаў. Шмат каго хвалюе гэта пытаньне, асабліва тых, чые пастановы не праводзіліся ў жыцьцё. Пастановы Полацкага гарсавету ня ўсе праводзяцца ў жыцьцё, мабыць з прычыны адсутнасьці кантролю над пастановамі.

Так, за апошні час было некалькі пастаноў аб рамонце вуліц і тратуараў. У кожнай пастанове зазначана, што ў выпадку невыкананьня пастановы кожны вінаваты павінен плаціць штраф у 25, 50 і 100 руб.

Невядома ці многім прыходзілася плаціць штраф за невыкананьне пастаноў гарсавету, а пакуль што полацкія вуліцы знаходзяцца ў дрэнным становішчы, тратуары паламаныя. На некаторых вуліцах немагчыма праехаць, балота што нагі ня выцягнеш.

Полацкаму гарсавету трэба хутчэй паклапаціцца аб наказах выбаршчыкаў і правесьці іх у жыцьцё.

Полацак. Т. В.

Весткі з месц.

НЯЎДАЛЫ ЧАС ВЫЗНАЧАН ДЛЯ СХОДАЎ.

Брагінскі РВК (Гомельскай акр.) паставіў арганізоўваць справаздачныя сходы ў сьвяточныя дні, у той час, калі прантыка мінулых кампаній паказала, што ў сьвяточныя дні ўвага сялянства бывае часта адцягнута рознымі забавамі і інш.

Таксама ня досыць выразна вызначана ў плане пытаньне аб арганізацыі нацыянальных вучастках, дзе адзначана, што нацыянальныя вучасткі павінны быць арганізаваны у месцох з значным насельніцтвам. Між тым, па апошняй дырэктыве, кожныя 100 выбаршчыкаў могуць паставіць дэпутата.

Такім чынам, там, дзе ёсьць кампактныя масы нацыяналасьцяў, з адпаведным лікам выбаршчыкаў могуць быць арганізаваны асобныя справаздачныя і выбарчыя вучасткі, калі такому вылучэньню не перашкаджаюць іншыя матывы.

ХАЛОПЕНЕЦКІ РВК ПАДРЫХТАЎВАЎСЯ.

У Халопенецкім райёне, Менскай акругі ўжо складзены агульны календарны план для справаздач і перавыбараў па ўсяму райёну. Створаны сельскія выбарчыя камісіі і вызначаны ўпаўнаважаныя па вучастках.

Замест 63 выбарчых вучасткаў у мінулую выбарчую кампанію, сёлета арганізавана 120 вучасткаў.

Сьпісы выбаршчыкаў і пазбаўленых праў выбараў ужо складзены. Зараз прапрацоўваюцца наказы, прыстасаваныя да ўмоў кожнага сельсавету.

Падрыхтаваліся да перавыбараў.

(Дрысенскі райён, Полаччына).

Закончылася падрыхтоўка да перавыбараў саветаў па райёну. Складзена райкамісія, якая дасланa на месцы належныя паказаньні.

Сельскія выбарчыя камісіі таксама скончылі падрыхтоўку.

Хутка распачнецца справаздачная кампанія. Тарас Варэіла.

Заваявалі аўтарытэт.

Наш сельсавет складаецца з 8 насельных пунктаў, з іх 4 буйныя, а іншыя—дробныя; апроч таго, ёсьць шмат асобных хутароў. На ўсе гэтыя пункты абрана ў с.-с. 10 чалавек, з якіх два працуюць стала—старшыня і сакратар, а рэшта—працуюць па сваіх вучастках. Сельсавет працуе па пляну. Праз кожныя тры месяцы складаецца плян працы, які выконваецца поўнасьцю; пасяджэньні прэзыдыуму адбываюцца кожны тыдзень. Пленарныя пасяджэньні сельсавету праводзяцца адзін раз у месяц, ня лічачы нечарговых пасяджэньняў. Сельсавет шчыльна зьвязан з насельніцтвам. Па пляну пасяджэньні разьмяркоўваюцца па ўсіх пунктах, дзе ставяцца жыцьцёвыя сялянскія пытаньні; вырашаюць пытаньні з удзелам шырокіх колаў самога насельніцтва. Наведваньне пленарных пасяджэньняў членамі сельсавету ня зусім акуратнае, але сельсавет прымае супроць гэтага ўсе меры.

Пры сельсавеце ёсьць пяць сэкцый: падатковая, зямельная, культурна-санітарная, па паляпшэньню дабрабыту і каапэрацыйная. Культурна-санітарная і па паляпшэньню дабрабыту камісіі ня зусім працуюць здавальняюча, ня гледзячы, на тое, што старшыні гэтых камісій зьяўляюцца членамі сельсавету.

Вучот аб'ектаў абкладаньня па сельсавету прайшоў здавальняюча, за выключэньнем толькі таго, што некаторыя заможнікі ўтаілі ралью, а сельсавет ня меў магчымасьці зрабіць абмер за адсутнасьцю каморніка. Але ўсё-ж па сельсавету выяўлена 60 дзесяцін ралькі і 75 дзесяцін сенажаці. Асабліва яскрава кідаецца ў вочы засьценак Заазер'е, дзе ўтоена і ня выяўлена ралькі і сенажаці прыблізна каля 160 дзесяцін. Калі сельсавет зьвярнуўся ў РВК за дапамогай, РВК адказаў, што ня можа дапамагчы, дзякуючы адсутнасьці каморніка. Так і засталася справа нявыяўленай. Беднаты вызвалена па сельсавету каля 120 гаспадарак.

На наш сельсавет было дадзена для рэалізацыі сялянскай пазыкі на 600 руб., якая поўнасьцю была рэалізавана. 2-ой пазыкі індустрыялізацыі таксама дадзена на 200 руб., з якіх 160 р. ужо рэалізавана. У нас старшыня с.-с. карыстаецца сярод насельніцтва аўтарытэтам.

Маазэйка С. К.

(Чавускі с.-с., Бабруйшчына).

Праца культурна-сацыяльнай сэкцыі гарсавету.

У сацыяльна-культурную сэкцыю ўваходзіць 27 асоб. Усёй працай сэкцыі кіруе выбранае бюро ў ліку 5 асоб.

Досыць акуратна праводзіліся пасяджэньні сэкцыі, усяго праведзена пасяджэньняў—27. Процант наведваньня сябрамі сэкцыі пасяджэньняў нязначны усяго 68 проц. Неакуратнае наведваньне тлумачыцца тым, што ў вялікай колькасьці членаў сэкцыі вячорнія заняткі ў школах, а пасяджэньні адбываюцца ўвечары.

Звычайным месцам пасяджэньняў сэкцыі—заля гарадзкога савету, але-ж у апошнія часы пасяджэньні практыкуюцца і на прадпрыемствах. Два пасяджэньні ўжо праведзены на фабрыцы „Чырвоная Бярэзіна".

Сэкцыяй узят быў напрамак на ўцягненьне 52 дэлегатак у працу сэкцыі але-ж ня гледзячы на ўсе стараньні сэкцыі ўцягнуць іх у працу, удзел у працы сэкцыі прымалі толькі 7 чалавек.

Таксама згодна пастановы прэзыдыуму гарсавету прымацованы былі да працы ў сэкцыі 18 чалавек-студэнтаў подтэхнікума выпускнога курса, яны прымалі актыўны ўдзел у працы сэкцыі, удзельнічалі ва ўсіх камісіях па абсьледаваньню розных устаноў.

Сэкцыяй зроблена абсьледаваньне сацыяльнага і маемаснага стану 126 асоб; зараз сэкцыі даручана абсьледаваць 250 беспрацоўных.

Сэкцыяй абсьледаваны наступныя масавыя і культурныя ўстановы: тры саводзкія амбуляторыі, 2 амбуляторыі гарадзкія, 2 больніцы, 2 кансультацыі, 9 школ, 5 розных дзіцячых устаноў, габінеты: рэнтгенаўскі, бактэрыялёгічны, савет фізкультуры і інш. Усяго зроблена 43 абсьледаваньні, праведзена ў жыцьцё 38 мерапрыемстваў.

Разгледжваліся пытаньні на пасяджэньнях сэкцыі: аб каштарысе культурных і лекавых устаноў г. Барысава, пытаньне аб сыстэме народнай асьветы, сетка новых школ, якія мяркуюцца адчыніцца ў г. Барысаве ў наступных 5 гадоў, будаўніцтва лекавых устаноў і шмат інш. дробных пытаньняў.

Клібанаў.

Барысаў.

СУМНЫ АПТЫМІЗМ.

(Ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта).

— Як у вас ідзе падрыхтоўка да перавыбараў саветаў?

— А што? Выбарчая камісія арганізавана і дадзены дырэктывы сельсаветам.

— І ўсё?

— І ўсё.

Такім прыблізна было мае інтэрв'ю са старшынёй Глускага РВК па пытаньню аб падрыхтоўцы да перавыбараў саветаў.

— А вось, напрыклад, на мясцох,—што зараз робіцца?—пытаюся я ў старшыні.

— А што? Рыхтуюцца! Дырэктывы атрымалі і рыхтуюцца.

— Справаздачы пішуць?

— Пішуць! Да 1-га сьнежня ўсе напішуць.

— А прадстаўніка райвыканкому прымацавалі да сельсаветаў?

— А навошта?—зьдзівіўся старшыня.

— А вось, кажу, памагчы сельсаветам у падрыхтоўцы справаздачы, напрыклад,—нязгадная рэч для сельсаветаў. Яны, бадай, ні ўсе справяцца з імі.

— Справяцца, сунакоўу мяне старшыня, а калі не, дык мы направім.

— А калі-ж мы папраўляць будзем?

— А вось зараз будзем езьдзіць па сельсаветах і тады будзем праглядаць і папраўляць.

— Выбачайце, кажу, плян ваш можна паглядзець.

— Плян? Хвілінку, выбачайце.

Старшыня сарнаўся з красла і джгануў у другі пакой.

— Канавалаў,—чуўся яго голас за дзьвярыма, прыходзь сёньня пасля абеду, будзем плян справаздачна-перавыбарчай кампаніі канчаць.

Старшыня вярнуўся і растлумачыў мне, што ў іх ёсьць, але яшчэ ня скончан.

„Добра, кажа, што вы напомнілі, а то я і забыўся пра яго.

Я падумаў і таксама рашыў, што добра зрабіў, бо каб я ня ўспомніў пра плян, дык старшыня, магчыма, агледзіўся-б канчаць яго тады, калі пачаліся-б перавыбары.

Такі падыход да справы падрыхтоўкі справаздачна-перавыбарчае кампаніі, на наш погляд, крыху аддае фармалізмам.

Што мы бачым у Глускім райёне? Атрымалі дырэктывы, прагледзілі, арганізавалі выбарчую камісію, далі дырэктывы сельсаветам і на гэтым супакоіліся.

Далей само ніхай круціцца.

А як яно гэта само круціцца, я меў магчымасьць наглядаць у Стара-Дарожскім райёне. Тут з надворнага боку прага зьвяцца крыху лепш ідзе. Выбарчая камісія арганізавана 19-га кастрычніка і складзен плян падрыхтоўча-справаздачнай кампаніі. Але нажаль за гэтым плянам не пасьпявае жыцьцё. Плян, які быў складзен, качэпне, не раней 19-га кастрычніка, прадугледжвае, каб з 21-га на 28-е кастрычніка па ўсіх сельсаветах былі праведзены пленумы, на іх абраны сельскія выбарчыя камісіі. За гэтач-ж тэрмін, па пляну, сельсаветы павінны скласьці пісьмовыя справаздачы аб сваёй дзейнасьці за час ад апошніх перавыбараў і абгаварыць гэтыя справаздачы на пленумах сельсаветаў. І гэта за адзін тыдзень. Як жа сельсаветы спраўляюцца з такой нагрузкай? Прыкладам гэтага можа быць Нова-Дарожскі сельсавет. У гэты сельсавет я прыйшоў у такі час калі праца бывае ў самым разгары і вядзіўся цішэйшай у сельсавеце. Пуста кругом—ні душы, толькі ў адным з далёкіх пакояў я знайшоў сэкратара сельсавету, які прытуліўся ў куточку за маленькім столікам так, што яго ня хутка і ўбачыш.

— Старшыня ў хаце?—пытаюся.

— Але, у хаце.

— А дзе-ж ён?

Тут сэкратар, відаць, скеміў, што я ня ведаю, дзе старшыня, і ў сваю чаргу спытаўся:

— А ён вам пільна патрэбен?

— Да-зарэзу!

— Ну, калі так, дык скажу.

Сэкратар вывяў мяне з памяшканьня сельсавету і паказаў:

— Вунь яго хата, там ён схаваўся.

— Чаго-ж схаваўся?

— Піша нешта пільнае, а тут перашкаджаюць, вось ён і схаваўся ў хаце.

І запраўды, старшыня схаваўся. За вялікім сталом, на куце, пад абразамі, старшыня абхаўшыся папкамі і паперамі так, што толькі галава тырчыць. Сядзіць, пасьпеціць.

— Што-ж вы такое цяжкае пішаце?—пытаюся.

— Ды вось-жа справаздачу гэту самую.

— А што, хіба цяжка?

— Цяжка, уздыхнуў старшыня, а памагчы некаму. Яно, каб за год, дык нічога, а то за два гады. А тут і Рык ніша, каб не адны лічбы былі, а каб наогул відаць былі дасягненьні.

Праўда, райвыканком у адносіне зазначае, каб сельсаветы пазбяжоўваліся ў справаздачах сухіх лічбамі, а каб справаздачы адбівалі ўсю практычную працу, характарызавалі выкананьне наказаў, пастаноў сходаў, пленумаў і г. д.

— Ёсьць у мяне летапіся справаздача, кажа старшыня, нашшу за сёлета год, а як іх злучыць—ня ведаю.

Гэта зразумела. У старшыні сельсаветаў выпрацаваўся ўжо пэўны трафарэт адносна гадавых справаздач, якія складаліся па некаторому шаблёну: „летась мы гэтага ня мелі, а сёлета—маем, летась мы мелі столькі і столькі, а сёлета гэтулькі і гэтулькі і тут-жа рост у процентах. Да гэтага старшыні прызвычаіліся. Сёлетнюю справаздачу на такому шаблёну яе напішам, бо яна складаецца не за адзін год, а за два. Тут ужо патрэбна штосьці новае. Як гэта новае ўнесьці—РВК не даюць практычных указаньняў, а старшыні сельсаветаў ня ведаюць як ўвязаць працу за два гады. Тэрмін напісаньня справаздач, вызначаны планам, зыходзіць і вось старшыні гоняць гэтыя справаздачы, каб хутчэй скончыць, абы напісаць.

Зразумела, што ад такой падрыхтоўкі нельга чакаць добрых вынікаў. А райвыканкомы гладзяць на гэта вельмі аптымістычна. „Рыхтуюцца! Зробім Нічагуткі!"

Ад такога аптымізму робіцца сумна; сёлетняя перавыбары саветаў, якія адбываюцца ва ўмовах некаторых нашых гаспадарчых няжкасьцяў, вымагаюць больш сур'ёзных адносін да сябе. Ясная рэч, што кулак сёлета, як ніколі, будзе стараца выкарыстаць гэтыя нашы часовыя гаспадарчыя няжкасьці ў варожых для нас мэтах, каб зрабіць уплыў на перавыбары, праніснуць у саветы сваіх людзей і там гнуць сваю кулацкую лінію.

Толькі добрая падрыхтоўка да перавыбараў можа даць адпор гэтым кулацкім імкненьням. А добрая падрыхтоўка патрабуе больш сталых адносін да яе.

Аптымізму не павінна быць месца.

Л. Савёнак.

Сельсаветы за працай.

Працуе здавальняюча.

(Уваравіцкі р., Гомельшчына).

Чэбатовіцкі сельсавет вызначаецца буйным у райёне. Склад сельсавету—21 чалавек, з якіх 10 чалавек беднякоў, 8 сераднякоў і 3 заможных. Сярод іх ёсьць 3 сялянкі, адна з іх зьяўляецца членам прэзыдыуму с.-с.

Сельсавет абслугоўвае 38 населеных пунктаў, з якіх найбольш буйныя—Чэбатовічы, Старая Буда і Рудня-Альхоўка.

Пры сельсавеце існуе група беднаты, што зрабіла працу сельсавету больш жвавай. Пасяджэньні прэзыдыуму і пленумы сельсавету праходзяць актыўна (амаль палова сяброў сельсавету выказваецца ў спрэчках, уносяць прапановы і г. д.). На пленумах сельсавету прысутнічае шмат сялян, якія таксама выказваюцца ў спрэчках і ўносяць канкрэтныя прапановы.

Праца сельсавету праводзіцца плянава. Пляны выпрацоўваюцца па-квартальна на 3 месяцы, а калядарныя—на адзін месяц. Трэба адзначыць, што галоўнае месца ў працы сельсавету займае гаспадарчае і культурнае будаўніцтва райёну, як напрыклад, пабудова мастоў, праца школы, аб злучным пункце, арганізацыя машынных таварыстваў і інш. пытаньні, якія цікавяць асноўную масу сялянства вёскі.

Усе пляны выконваюцца на 75-80 проц. Напрыклад: па пляну сельсавету 4 пасёлкі перайшлі на шматпольле, арганізаваны 2 машынныя таварыствы ў пасёлках Леніна і Сенавец, адчынен злучны пункт на сродкі ад рэалізацыі пазыкі ўзмацненьня сельскай гаспадаркі, а на сродкі ад самаабкладаньня ў пас. Леніна абсталявана пасёлкавая школа (сёлета адчынен трэці камплект) у якой будуць вучыцца дзеці беднаты, якія раней бегалі за 3-4 вярсты у школу на вёску і г. д.

Машынныя таварыствы ўжо забясьпечаны машынамі і працуюць. Працуе і падсобны пункт малочнай арцелі, у працы якой, нажаль, прэзыдыум сельсавету прымае слабы ўдзел. За лета ў малочную каапэрацыю ўступіла 70 чал., з якіх 30-35 пераходзяць на правільнае кармленьне жывёлы. Аднак, пры ўдзеле сельсавету можна было-б дабіцца лепшых вынікаў.

Досыць добра працуе камітэт сялянскай узаемадапамогі. Арганізаваны пракатны пункт, дзе маюцца 2 малатарні, веялкі, ільнамялкі, саламарэзкі і інш. машыны. Закладзен паказальны вучастак па штучнаму ўгнаеньню, беднаце аказваецца дапамога.

Пры сельсавеце працуюць сэкцыі: сельска-гаспадарчая, па ўпарадкаваньню, культурная і падатковая. У працу сэкцый уцягнута 30 сялян, большасьць якіх прымае актыўны ўдзел у працы сельсавету. Дзякуючы с.-гаспадарчай сэкцыі ўжо амаль усе пасёлкі сеюць канюшыну, віку і інш. Упарадкаўчая сэкцыя садзейнічала пабудове новых мастоў, дарог і г. д.

Ёсьць у працы сельсавету і недахопы. Незадавальна даставка праводзіцца клясавая лінія, ня гледзячы на тое, што старшыня сельсавету зьяўляецца бедняком і добра ведае аб патрэбах сялянства. Напрыклад: ня ўсе сродкі ад самаабкладаньня (грашовая частка) высканы. Бедната, зразумела, вызвалена ад аплаты грашыма, яна адпрацоўвала, а заможнікі яшчэ ня ўсе да гэтага часу выплацілі самаабкладаньне, што затрымлівае выкананьне пастаноў, прынятых сходамі. Быў такі выпадак. Тыдзень таму назад загарелася гумно ў селяніна, прыбеглі людзі гасіць пажар, калі ён ужо быў загашан, тады толькі прыехала пажарная дружына. Пажарная машына была яшчэ бяз колаў, бочкі без вады, а багроў і тапароў і ў наміне ня было.

У райёне сельсавету маецца сельска-гаспадарчая арцель «Вэкер», сябрамі якой зьяўляюцца яўрэі, яны скардзяцца на сельсавет, што апошні не дапамагае ім у палепшаньні іх гаспадаркі, асабліва гэта арцель перапіць ад патраўшчыкаў-заможнікаў.

Злучны пункт сельсавету аддадзен на утрыманьне аднаму селяніну, тады як можна было выхад яго арганізаваць жывёлаводчае таварыства, тым больш, што сялянства імкнецца да палепшаньня пароды жывёлы.

С. Я.

Праца Крупіцкага сельсавету.

(Самахвалавіцкі р., Меншчына).

На адным з пленумаў сельсавету, старшынёй сельсавету была зроблена справаздача аб працы сельсавету амаль што за цэлы год. Падагуліўшы ўсю працу сельсавету, прымаючы пад увагу перагружанасьць грамадзкай працай як целкам усяго складу сельсавету, так і кожнага сябра паасобку і ўсе далёка няспрыяючыя ўмовы, трэба згадзіцца з тым, што праца сучаснага складу сельсавету досыць здавальняючая.

Райён сельсавету вялікі. Зьбіраючы спагнаньнем самаабкладаньне, падатак, страхавыя выплаты працаўнікам прыходзіцца траціць шмат часу, адрываюцца ад працы ў канцэлярыі падчас не пакідаючы ніводнага працаўніка на месцы.

Па ўсяму сельсавету самаабкладаньне праведзена на 35 проц., якое амаль што палкам скарыстана на прызначэньнях. Адрамантаваны дзьве школы, адна будуецца новая. Дарогі, масты, дзе раней нельга было праехаць, зараз папраўлены, пастаўлен громаадвод.

Пры правядзеньні вучоту аб'ектаў абкладаньня шмат выяўлена ўкрытай жывёлы, пашні, сенажаці, асабліва сярод заможнага насельніцтва. Калі слаба распаўсюджвалася пазыка ўзмацненьня сялянскай гаспадаркі, дык нельга гэтага сказаць адносна 2-й пазыкі індустрыялізацыі. Тут сельсавет лепш уцягнуў у працу вясковы актыў, падабраў больш працаздольны склад суб'агентаў. Кампаніі праводзіліся пры дапамозе настаўніцтва, сувязь з якім сельсавету добрая, і камсамольскай ячэйкі. Дапамога з боку Ганнапольскага парт'ячэйкі была добрая ва ўсіх правядзімых сельсаветам мерапрыемствах, асабліва пры правядзеньні самаабкладаньня.

У райёне сельсавету ёсьць 7 мэліяцыйных т-ваў, з якіх добра працуюць: Крупіцкае, Пазьдзеркаўскае і горні Дубіцка-Слабодзкае. Тарфянае т-ва толькі адно, але праца ў ім пастаўлена, у параўнаньні з мінулым годам, значна лепш. Перабрана праўленьне, якое лепш узялося за працу.

У далейшым, каб паставіць працу сельсавету на належную вышыню, неабходна сталае інструктаваньне працаўнікоў сельсавету з боку РВК. Вельмі было-б пажадана, каб на пленумах сельсаветаў прысутнічаў прадстаўнік райвыканкому. Ён памог-бы разьвязаць шмат пытаньняў і быў-бы знаём з працай сельсавету.

Райённы.

Адзін пленум за паўгода.

(Пухавіцкі р., Меншчына).

Праца Сяргеевіцкага сельсавету вусім дрэнная. За пяць месяцаў, пачынаючы з красавіка і да гэтага часу, адбыўся адзін толькі пленум сельсавету, хаця пленумы і склікаліся разы два, але ніхто не зьявіўся, бо сельсавет не карыстаецца аніякім аўтарытэтам, асабліва старшыня Тарашкевіч П.

Перад апошнім пленумам, які адбыўся ў другой палавіне жніўня м-ца, старшыня ня даў справаздачы аб сваёй працы, толькі прачытаў залежаныя паперкі - абежнікі і асабліва цікава быў выпушчан адзін абежнік прысутным членам сельсавету.

Пухавіцкі РВК ад 9-УШ—28 г., за № 5957 прыслаў такую адносіну сел. савету:

«Пасьмяючы пры гэтым вынікі абсьледаваньня Гомельскай АКК і прапановы вынесеныя прэзыдыумам па пытаньню аб выліквідаваньні райённых зямельных камісій, райвыканком прапануе абгаварыць гэты праэкт на пашыраным пленуме с-с. з удзелам усяго вясковага актыву і калі маюцца зямельныя спэцыялістыя, якіх прыцягнуць у якасьці дакладчыкаў».

Старшыня Тарашкевіч ня ведаю, чытаў ці не прыкладзеную да адносін паперку вынікаў абсьледаваньня, а толькі сказаў:

— Вось тут ёсьць цыркуляр Гомельскай акруговай камісіі. Там усе работнікі засыпаліся і ня могуць разабрацца ў зямельных справах і калі хто з вас ёсьць спэц па зямельных справах, дык можа падаць заяву і яго прымуць на службу...

Калі старшыня ня мог разабрацца ў „цыркуляры», дзе напісана чорным па беламу аб выніках абсьледаваньня райённых зямельных камісій, выліквідаваньні іх, в мотаю ўтварэньня апошніх пры сельсаветах, якім чынам і г. д., дык адносіна Пухавіцкага РВК яскрава высьвятляла гэтае пытаньне, якое трэба было ўважліва прачытаць і растлумачыць. Але справа ў тым, што ні абежнікі, ні адносіны РВК ня чытаюцца як трэба, а выконваюцца—я ўжо і не бяруся яе і сказаць.

Альбо вось яшчэ спраўка, выдадзеная старшынёю, якую я зьмяшчаю цалкам.

«Дадзена Гэта г-ну в. Сяргеевіч Юркевічу Давыду ў тым што с'рата Юркевіч Марыя запісана ў падворную кніжку ў сямейства Юркевіча Давіда, а таксама ўведзена і земля ў 1927 гаду уліку 1,65 дз.».

Другую спраўку, але трохі раней, старшыня выдаў такога-ж самага зьместу селяніну в. Сяргеевіч Юркевічу Алесю, толькі з такімі вынемамі: «Сірата Юркевіч Марыя ў падворнай кніге ў сямейсьцьве Давыда Юркевіча на лічыцца».

Цяпер паўстае пытаньне. Якая-ж спраўка лічыцца правільнай? Зачым старшыня выдаў дзве спраўкі двум сялянам?

Селькор.

Агляд груп беднаты і перавыбары саветаў.

Наступаючыя перавыбары саветаў будуць праходзіць у надзвычайна складаных абставінах, пры ўзросшай клясавай барацьбе як у горадзе, так асабліва ў вёсцы. Таму асабліва важна гэту кампанію правесьці з добрай падрыхтоўкай і арганізаванасьцю, з найбольшым узьдымам.

Неабходна перавыбары саветаў, як важнейшай палітычнай кампаніі, надаць выключна масавы характар,—уцягнуць у гэтую справу ўсю партыю, усе прафэсыянальныя саюзы, увесь камсамол, увесь савецкі актыў, усё батрацтва і беднату, усіх сераднякоў.

У ходзе справаздач саветаў і іх перавыбараў трэба паставіць, як асноўную задачу: праверку вынікаў практычнага будаўніцтва саветаў, агляд работы савецкіх, гаспадарчых, каапэрацыйных арганізацый, агляд таго, як ажыцьцяўлялася кіраўніцтва савецкім, гаспадарчым і культурным будаўніцтвам з боку партыйных арганізацый.

Трэба шырока разгарнуць самакрытыку і пры яе дапамозе дабіцца ажыцьцяўленьня гаспадарчых і культурных мерапрыемстваў, паляпшаючых становішча краіны. Шляхам самакрытыкі патрэбна ачысьціць і аздаровіць апараты саветаў, высунуўшы на работу новыя кадры з рабочых, батракоў, бедняко ў і лепшых сераднякоў.

Перавыбары саветаў павінны быць ня проста перавыбарамі; трэба дасягнуць таго, каб перавыбары «зьявіліся магутным наступленьнем на нашага клясавага ворага,—кулака, нэпмана, бюракрата. Не абарона ад нападу кулака, а наступленьне як па агульна-палітычнай лініі, так і па канкрэтных пунктах выяўленьня кулацкай актыўнасьці на вёсцы, не абараняцца ад кулака на сходах трэба, а так умець арганізаваць беднату, батрацтва і пралетарыят, каб замест абароны было арганізавана новае наступленьне на кулака, каб кулак быў адсунуты яшчэ далей, а серадняк поўнасьцю і цалкам быў бы з пралетарыятам».

Трэба падкрэсьліць, што тая клясавая барацьба, якую мы маем цяпер, у часе перавыбараў саветаў вызначыцца больш выразна, яна прыме яшчэ больш вострыя формы. Наш клясавы вораг на вёсцы—кулак і розныя былыя людзі, ня гледзячы на тое, што яны пазбаўлены выбарчага права, усё-ж актыўнасьць сваю будуць выяўляць і пры дапамозе сваіх падпявал будуць імкнуцца праводзіць свае прапановы. Дзеля гэтага яны будуць старанна скарыстоўваць усе цяжкасьці, зьявяваныя з рэканструкцыяй народнае гаспадаркі, а таксама і недахопы практычнай работы ў паасобных зьвеньнях.

Трэба мець на ўвазе, што барацьба гэта будзе неадналькавай ва ўсіх райёнах. Больш актыўна будзе выяўляць сябе кулак там, дзе райённыя арганізацыі (партыйныя, савецкія і грамадзкія) ня будуць падрыхтаваны, дзе ня будзе арганізавана батрацтва і беднота.

Адсюль можна бачыць, што «работа па арганізацыі батрацтва і згуртаваньня беднаты, якая зьяўляецца апорай рабочае клясы ў вёсцы, ёсьць важнейшая задача нашай масавай палітычнай работы». Адсюль можна бачыць важнасьць такога мерапрыемства партыі, як агляд дзейнасьці груп.

Акругкомы, райкомы, на падставе дырэктыўнага ліста ЦК УсеКП(б) (гл. «Правду» № 249 за 25 кастрычніка) зараз-жа павінны разгарнуць работу па агляду груп беднаты, вылучыўшы для гэтай работы адказных акруговых і райённых працаўнікоў з такім разьлікам, каб у кожным райёне быў прадстаўнік АК і ў кожнай ячэйцы, дзе арганізаваны групы беднаты—прадстаўнік РК.

Навакол работы з беднатой праз агляд дзейнасьці груп неабходна ўтварыць шырокую грамадзкую думку ўсіх партыйных, камсамольскіх і грамадзкіх арганізацый. Неабходна дабіцца рашучага пералому ў палепшаньні якасьці работы груп і ўсёй работы з беднатой. Трэба дасягнуць таго, каб за работу груп адказвалі ня толькі вылучаныя для гэтага таварышы, а цалкам уся арганізацыя райёну, каб увесь партыйны актыў цікавіўся гэтай работай і праводзіў яе, каб камсамольскія арганізацыі прыцягваліся належным чынам і ў дастатковай меры да работы з беднатой, галоўным чынам, па арганізацыі батрацкай і бядняцкай моладзі.

Шляхам агляду груп трэба рашуча ажыць такія зьявішчы, калі дырэктывы партыі па арганізацыі беднаты праводзяцца недастаткова і марудна. Для прыкладу возьмем хоць-бы Заслаўскі раён, толькі што абсьледаваны інструктарам ЦК. Што там бачым?—З боку работнікаў райкому падбайнасьць, а з боку сяброў ячэек, паколькі ім ня было належнай практычнай дапамогі, ня было неабходнага інструктаваньня,—поўнае неразуменьне важнасьці работы з беднатой і няўменьне яе праводзіць. У выніку—у райёне працуе толькі адна група.

Ня гледзячы на тое, што да справаздач саветаў засталося вусім мала часу, у райёне нічога канкрэтна ня зроблена ў напрамку арганізацыі беднаты да гэтай адказнай справы; больш таго, райённая арганізацыя на чале з райкомам партыі не клапоціцца аб гэтым. Паўстае пытаньне, дзеля чаго бюро ЦК у сваім лісьце «Акругкомам, райкомам і ячэйкам» задоўга да перавыбараў саветаў пісала «асаблівую ўвагу зьвярнуць на падрыхтоўку арганізаванага і актыўнага ўдзелу ў кампаніі перавыбараў саветаў вясковае беднаты, дзеля чаго выпрацаваць па кожнай акрузе, райёну, сельсавету канкрэтныя пляны і дырэктывы аб скліканьні і працы сходаў беднаты і асабліва аб удзеле груп беднаты ў гэтай кампаніі».

Агляд груп павінен дапамагчы ўбачыць ня толькі заслаўскім таварышам, а і шэрагу іншых райёнаў, дзе работа з беднатой, як сьведчаць матар'ялы, пастаўлена надзвычайна слаба,

НА ПРЫСУД РАБОЧЫХ МАС

(Тэматычны плян Белдзяржкіно на 1928-29 год.).

На старонках нашых газэт ужо распублікован тэматычны плян вытворчасьці Белдзяржкіно на новы апэрацыйны год. Зараз калі за мінулы год удалося наладзіць у Ленінградзе ўласную кіно-фабрыку, Белдзяржкіно больш пляннава ўжо ставіць сваю вытворчасьць. Каб правільна ацаніць апублікаваны плян, трэба ўлічваць дзьве ўмовы, якія ўплывалі пры яго складаньні. Папершае, па сваіх матар'яльных сродках Белдзяржкіно мае магчымасьць выпусьціць за бліжэйшы год толькі 10 мастацкіх фільмаў і 4 культурфільмы, гэта значыць, вельмі абмежаваны кантынгент і, такім чынам, ня мае магчымасьці ў адзін год ахапіць усе тэмы, якіх вымагае нашае сучаснае жыцьцё. Па-другое, у пракатным карыстаньні Белдзяржкіно будзе багатая даборам вытворчасьць совкіно, ВУФКУ і інш. кіновытворчых арганізацый, якія сваімі тэмамі (пляны іх апублікаваны) маюць замер забясьпечыць значна паўной патрэбы палітычнага і культурнага жыцьця Савецкага Саюзу.

Вось чаму ў даборы сваіх тэм Белдзяржкіно галоўную ўвагу зьвярнула на такія тэмы, якія маюць асаблівую сваю адпаведнасьць патрэбам нашай тутэйшай сучаснасьці або даюць мінулае жыцьцё Беларусі.

З тэм сацыяльна-бытавога зьместу, набудаваных на матар'яле гораду, праектуецца: праблема вашага сацыялістычнага будаўніцтва са сваімі станоўчымі і адмоўнымі бакамі (бюракратызм, цяганіна, сьвядомае і несьвядомае шкодніцтва і г. д.) „Грышка сьвінапас"; быт і барацьба моладзі за сваё аслабаненьне ад старое сям'і—«Палаючы мост» і нарэшце, «У вышыню»—рабочая жыльлёвая кааперацыя, як зьявішча апошніх двух-трох год. На матар'яле вёскі пабудаваны будуць наступныя тэмы, зьмест і прынцыповая ўстаноўка якіх такая: «Перадзел»—барацьба кулацтва супроць кааперацыі і роля вясковае моладзі ў будове новых форм каапераванае працы; «Бабская атака»—актыўная роля вясковых жанчын у стварэньні калектыўнае гаспадаркі і «Лес»—эканамічна-вытворчая роля лесу пры абшарніках і зараз—за савецкаю ўладаю. Сёмы фільм на сучасныя тэмы гэта „Ля рубежных слупоў", які малюе ўмовы жыцьця парубежнае беларускае вёскі, часткова атручанае кантрабандывмам, з якім актыўна змагаецца лепшая частка сялянства.

Усе гістарычныя тэмы, канешне, трактуюцца в клясавым асьвятленьнем гістарычных падзей. «Наша крепасьць» дае зьвяшча ў 1905 г. у Бабруйскай крэпасьці, заадно малюючы быт царскае армії в „мясаедаўшчынаю" (шпіёнажам) і адмоўнымі бакамі салдацкае „верхае" службы цару. „3-нд ярма" пераносіць вас, праўда, ужо ў 17 век, аднак, трактуе тую гэраічную барацьбу, якую працоўныя прабавалі весьці ў тыя часы. „Канец блазна" малюе часы Паўла І на Беларусі і абставіны бунтаў работнікаў на расійскіх мануфактурах. «Піянэр на дазоры» павінен будзе паказаць тыя шляхі, якімі перадавая піянэрыя выконвае сваю выдатную выхаваўча-арганізацыйную ролю. Дзеці бяспрытульныя адбіты ў фільме «Кветкі жыцьця».

Любы з гэтых названых фільмаў можа адказаць запатрабаваньням рабочага і сялянскага гледача. Калі-ж узяць тэмы ўсяго пляну палкам, тады выразнасьць гэтай выдзержанасьці пляну стане вусім яснай, бо тут ёсьць сярод тэм пляну шмат чаго: індустрыялізацыя БССР («Асіград»), праблема міжнароднага рэвалюцыйнага руху („Імя ім безьліч"), барацьба моладзі за сваю асьвету («Магнэс»), рацыяналізацыя мэтадаў выкарыстаньня вямлі („Новы шлях"), перасіленьне нацыянальных перажыткаў («Сьмяцьцё», «Карума», «Мсьцівец»), рэвалюцыйная барацьба латыскіх працоўных мас з царскім самаўладзтвам („Лясныя браты") і г. д.

Сэрыя палітычна-асьветных тэм для культур-фільмаў падабрана адпаведна патрэбам нашага часу. Мы яшчэ слаба ведаем свой край—уцэлым, асабліва з пункту гледжаньня найбольш канкрэтных яго асаблівасьцяў і каб шырока задаволіць гэтую патрэбу запраектован «Кіноатлас». Фактычным дасягненьнем кааперацыі ўсіх відаў у Сав. Беларусі прысьвечан будзе фільм «Супольнымі сіламі». З яўрэйскімі калектыўнымі гаспадаркамі знаёміць фільм «За плугам».

Нарэшце, індустрыялізацыя нашае дагатуль яшчэ сельска-гаспадарчае краіны—найважнейшая в усіх праблем нашага будаўніцтва. Дасягненьнем у гэтым напрамку павінен прысьвечан быць фільм „Поўнымі крокамі".

Запас тэм для культурфільмаў закранае таксама патрэбнае—тут і багатыя для БССР магчымасьці па выкарыстаньню торфу як прадукта тэхнолёгічна-хімічнага і высьвятленьня вялікае культурнае і палітычна-выхаваўчае ролі Чырвонае арміі і г. д.

Яз. Дыла.

Год працы кас ашчаднасьці БССР.

СЕТКА АШЧАДНЫХ КАС БССР.

Сетка ашчадных кас вылучэцца прыладай для прыцягненьня ўкладчыкаў. Пагэтаму неабходна найбольшае прыбліжэньне ашчадных кас да насельніцтва і найбольш правільная арганізацыйная пабудова сеткі дзеля ахопу ўсіх колаў насельніцтва як у горадзе, так і на вёсцы.

Рух сеткі кас за апошнія гады наступны: на 1 кастрычніка 1924 г. усяго кас было 219, з іх 192 сельскіх, на 1 кастрычніка 1925 г.—273, з якіх 231 сельскіх, на 1 кастрычніка 1926 г.—443, з іх 334 сельскіх, на 1 кастрычніка 1927 г.—431, з іх 332 сельскіх і на 1 кастрычніка 1928 г.—422, з якіх сельскіх—310.

З гэтых лічбаў мы бачым, што масавы рост ашчадных кас за апошнія гады затрымаўся. У сучасны момант пытаньне аб сеткі кас пераносіцца выключна ў галіну перагляду самой формы будоўлі кас ашчаднасьці.

У 1927-28 г. мы правялі шэраг мерапрыёмстваў па палепшаньню сеткі. Спынімся на асноўных з іх: у мінулым годзе арганізавана адзіная Акруговая Цэнтральная Каса з падпарадкаваньнем ёй усіх ашчадных кас у акрузе. Гэтая рэформа зьяўляецца вельмі важнай у напрамку палепшаньня кіраваньня ашчаднай справай у акругах.

Нажаль, акруговыя касы яшчэ не зразумелі тэй важнай ролі, якую яны адыгрываюць, і не ажыцьцяўляюць належнага кіраваньня ашчаднай справай у акрузе.

Акрамя гэтага, мы маем такое становішча, што ў радзе округ мясцовыя савецкія і партыйныя органы не зварочваюць належнай увагі на ашчадную справу і не дапамагаюць у належнай ступені працы кас ашчаднасьці. Зразумела, гэта вельмі дрэнна адбіваецца па разьвіцьці ашчаднай справы.

Далей, мы арганізавалі пры акруговых канторах сувязі аддзяленьні цэнтральных кас, якім перадалі нагляд за працай усіх паштовых кас у акрузе. Дзякуючы таму, што акруговыя канторы сувязі мала зварочваюць увагі на працу кас, гэтая рэформа не дала тых вынікаў, якія маглі быць дасягнуты пры належных адносінах да ашчаднай справы акруговых кантор сувязі. Удзельная вага паштовых кас у агульнай сыстэме ашчадных кас вельмі значная (72 проц.), пры гэтым трэба мець на ўвазе, што паштовыя касы зьяўляюцца асноўным званом ашчаднага апарату на вёсцы. Вось чаму праца паштовых кас мае вельмі вялікае значэньне.

У якасьці вопыту мы арганізавалі касы ашчаднасьці пры некаторых райвыканкомах і ўвялі спэцыяльных штатных працаўнікоў у некаторых паштовых касах. У сучасны момант яшчэ нельга даць поўны аналіз гэтых мерапрыёмстваў, але трэба адзначыць, што тыя касы, у якіх ёсьць адпаведныя працаўнікі, дасягнулі значна большых посьпехаў, чым іншыя касы.

Нашы далейшыя задачы ў галіне сеткі кас ашчаднасьці ў асноўным наступныя:

Трэба ўзмацніць тэмп працы акруговых кас, пашырыць яе межы, забясьпечыць ёй актыўную дапамогу з боку ўсіх мясцовых органаў і савецкай грамадзкасьці найлепшым чынам вырашыць пытаньні ўнядрэньня сыстэмы дзяржкредыту ў вёску.

Падольскі.

Драбленьне стыпэндый—крок назад.

З 1-га кастрычніка стыпэндыі студэнтам значна павялічаны, яны зараз ужо больш-менш набліжаюцца да прэхтычнага мінімуму.

Тым ня менш стыпэндыяльнае пытаньне па навучальных установах значна завастрылася. Вольных стыпэндый, вызваленых ад выпускаў мінулага году, не хапае для задавальненьня студэнтаў новага прыёму, якія па сваёму сацыяльнаму становішчу маюць права іх атрымаць. Разам з гэтым студэнты—служачыя, якія атрымліваюць невялікую пэнсію, кідаюць працу і імкнуцца атрымаць стыпэндыю.

Гэткае становішча пагыбляецца яшчэ і тым, што ў большасьці навучальных устаноў прыём аказаўся больш нормы, якая была зацьверджана адпаведнымі органамі.

Пад напорам неатрымаўшых стыпэндый, у некаторых працаўнікоў узьнікае пытаньне аб дзяленьні стыпэндый, гэта значыць выдачы адной стыпэндыі 2-м ці 3-м асобам. Супроць гэткіх тэндэнцыяў катэгарычна выказаецца студэнцтва,—забараніў гэта рабіць яшчэ ў мінулым годзе і Наркамасьветы, які спачатку гэтага навучальнага году зноў пацьвердзіў сваю пастанову. Практыка мінулых гадоў паказала, што гэта не дасягае сваёй мэты.

Зараз, у сувязі з павялічэньнем стыпэндый, імкненьні да драбленьня стыпэндый асабліва выяўляюцца. Пачыная хістацца і ПКА, які толькі яшчэ некалькі тыдняў катэгарычна забараняў гэта рабіць.

Сапраўды, калі 20-цірублёвую стыпэндыю студэнта тэхнікуму ці 30-цірублёвую ў ВНУ выдаць 2-м студэнтам, гэта значыць—абодвых не забясьпечыць, прымусіць абодвых, як і раней, не займацца, шукаць сродкаў да існаваньня.

Сабеседскі подыход да стыпэндый трэба зьмяніць,—нельга-ж „вырашать" пытаньня так, каб „усім па трохі", бо ад гэтага ня будзе ніякай карысьці.

Павялічэньне процанту забясьпечаньня студэнтаў стыпэндыямі шляхам іх драбленьня—гэта толькі надворны бок,—сацыяльны і акадэмічны эфект гэтым толькі паменьшыцца,—гэта не вырашэньне пытаньня.

Стыпэндыя выдаецца сацыяльна лепшай частцы, трэба яе асьцярожна адабраць і даць ёй магчымасьць працаваць, каб выканаць ускладзены на яе абавязак.

Каб задаволіць новы прыём, які заслугоўвае большай увагі па свайму сацыяльнаму складу, неабходна перагледзець стары склад стыпэндыятаў, бо на старэйшых курсах сацыяльны склад адносна горшы, бо шмат яшчэ атрымлівае стыпэндыю ня маючы на тое права, аб чым сьведчаць штодзень выяўляемыя ўсё новыя і новыя факты па навучальных установах. Перагледзеўшы стары склад, магчыма будзе вызваліць некаторы лік стыпэндый для новага прыёму.

Хваля не атрымаўшых стыпэндыі, сярод якіх і значны лік такіх, якім не належыць не атрымліваць—наступае на дырэктароў тэхнікумаў, вынікам чаго некаторыя з іх пачынаюць рабіць «рэформы», каб задаволіць „усіх па трохі",—гэта мы маем у Заранецкім с.-г. тэхнікуме, гэта мы мелі ў Віцебскім Мастацкім тэхнікуме, дзе амаль кожны атрымліваў стыпэндыю ў 5 руб.; вынікам гэтага з тэхнікуму ўцякалі, кідалі вучыцца, зьявіліся ўпадніцкія настрої, якія мы маем у шмат якіх тэхнікумах.

У ВНУ ад гэткіх «стыпэндыяльных падачак» адмовіліся, няма драбленьня стыпэндый і ў РСФСР і УССР, трэба даць рашучы адпор і гэткім тэндэнцыям у адносінах да тэхнікумаў БССР.

Побач з гэтым неабходна паставіць пытаньне аб дадатковым асигнаваньні хапя-б 500 стыпэндый, што складае 120.000 руб. Гэта ў асноўным зьмяніць утварыўшаяся становішча. Але ці будуць адпушчаны гэтыя стыпэндыі, ці не—дзяліць маючыяся нельга. Каб сур'ёзна, на справе скрануць з месца справу падрыхтоўкі спэцыялістых, у гэтым напрамку ліквідуючы пленум ЦК УсеКП(б) даў яскравую дырэктыву аб паменшаньні матар'яльнага становішча пралетарскага студэнцтва, каб былі створаны неабходныя ўмовы працы, без чаго немагчыма падрыхтаваць неабходных высока-кваліфікаваных працаўнікоў. Драбленьне стыпэндый—супярэчыць гэтаму, гэта крок назад у матар'яльным забясьпечаньні студэнцтва. Трэба-ж на практыцы забясьпечыць, а ня ў процантах «фантастычных лічбаў».

Т. Гурвіч.

ХРОНІКА.

У Беларускай Акадэміі Навук.

ВЫДАНЬНЕ БЮЛЕТЭНЮ.

Прэзыдыум БАН пастанавіў выдаць бюлетэнь аб сваёй дзейнасьці за апошні год. Бюлетэнь будзе памерам у 6 друкаваных аркушаў.

ВЫВУЧЭНЬНЕ ВЫТВОРЧЫХ СІЛ БЕЛАРУСІ.

1-га сьнежня г.г. Аддзел Прыроды і Гаспадаркі склікае пленум камісіі па вывучэньню вытворчых сіл Беларусі. Пленум мае разглядзець цэлы шэраг пытаньняў, зьвязаных з вывучэньнем Савецкай Беларусі.

УСЕБЕЛАРУСКАЯ КРАЯЗНАЎЧАЯ КАНФЭРЭНЦЫЯ.

У сьнежні г.г. адбудзецца пераважна краязнаўчых арганізацый, якія знаходзяцца на абшарах БССР. У пачатку 1929 г. будзе склікана Усебеларуская Краязнаўчая Канфэрэнцыя, у якой прымуць удзел толькі тыя краязнаўчыя арганізацыі, якія ўвойдуць у сьпіс і пададуць справаздачу аб сваёй дзейнасьці.

Падрыхтоўка да кастрычнікаўскіх урачыстасьцяй.

Дзіцячыя сады—да сьвята Кастрычніка.

У часе сьвята 11-й гадавіны Кастрычнікавай рэвалюцыі на дзіцячых садох будуць праводзіцца ранішнікі для дзяцей. Дзеням будзе таксама выдавацца паленшанае харчаваньне. Гарадзкія дзіцячыя сады насылаюць падарункі і лісты дзіцячым установам, якія знаходзяцца па райёнах Менскай акругі.

20 новых будынкаў.

Беларускі «Осэт» у дні сьвята 11-й гадавіны Кастрычнікавай рэвалюцыі адчыніць на Заходніх калёнізацыйных фондах 20 новых будынкаў.

Першы Белдзяржтэатр—да сьвята Кастрычніка.

7-га лістапада 1-шы Беларускі Дзяржаўны Тэатр паставіць новую прэм'еру «Бронецягнік» Усевалада Іванова.

Пастаноўка адбудзецца дарэмна для рабочых і чырвонаармейцаў.

Дарэмныя кіно-сэансы.

У дні сьвята кастрычнікаўскіх урачыстасьцяў ува ўсіх кіно-тэатрах Менску будуць дадзены бясплатныя кіно-сэансы для рабочых і служачых. Усяго мяркуецца пратусьціць каля 7000 чал.

У ПРЭЗЫДЫУМЕ АКРВЫКАНКОМУ.

Перайменаваньне нарсудоў.

Нарсуды Менскай акругі, за выключэньнем гарадзкіх, пераіменаваны: нумарная сыстэма заменена назвай па тэрыторыі. Напрыклад: будзе лічыцца не нарсуд 9-га вучастку, а нарсуд Вузьдзенскага райёну.

Чарговы Пленум АВК.

Чарговы пленум Менскага Акрвыканкому назначан на лістапад і мае адбыцца у Смалявічах, ці ў Плешчаніцах.

Падвойны склад зямельнай камісіі.

У сувязі з тым, што ў Менскай акруговай зямельнай камісіі згуртаваўся вялікі запас зямельных скаргаў, прэзыдыум АВК вызначыў дадатковую акруговую зямельную камісію пад старшынствам тав. Ліцевіча.

Першыя суботнікі на дапамогу школе.

Гарадзкі райком ЛКСМБ агрымаў першыя весткі аб правядзеньні суботнікаў у дапамогу школе.

Першы суботнік быў праведзен у аб'яднаній прафтэхшколе, у якім прымалі ўдзел усе вучні школы. У суботу, 3-га лістапада адбудзецца суботнік на карысьць школе па збору лому на Эльводзе, у якім прымуць удзел усе рабочыя.

Афіцыйна суботнік у дапамогу школе будзе праводзіцца па Менскай акрузе з 1-га па 15-га сьнежня.

Попыт на беларускую мэблю.

Маскоўская кантора Белнайгандлю адзначае ўзмацнёны попыт на венскія крэслы, вытворчасьці Віцебскай дзяржаўнай мэблявай фабрыкі і Магілёўскага прамысловага саюзу.

Попыт працягваецца, галоўным чынам, нізавой сыстэмай кааперацыі.

За першую палову кастрычніка месяца, маскоўскай канторай Белнайгандлю рэалізавана каля 10 вагонаў бехарускай мэблі.

Загатоўкі кішсыравіны.

Водлуг даных Наркамгандлю на ўсёй БССР за мінулы гаспадарчы год загатоўлена кішсыравіны 196 706 камплектаў гнаяжых кішак, або 98,4 проц. пляну; 52519 камп. авечых, або 35 проц. пляну; і 21.627 камп. сьвіных, што складае 216,3 проц. гадавога пляну. Вялікае недавыкаваньне пляну па авечай кішсыравіне тлумачыцца тым, што ўсей авечак на бойнях праведзіцца ў назначных разьмерах, а загатоўка ў сельскіх мясцовасьцях ня была арганізавана.

Барацьба з алкагалізмам.

У сучасны момант на буйных заводах Менску ўжо арганізаваны 6 вузлоў на барацьбе з алкагалізмам. У бліжэйшы час часовым камітэтам т-ва па барацьбе з алкагалізмам склікаецца канфэрэнцыя, на якой будзе зацьверджан устаў т-ва і абраны акруговы камітэт.

Як праходзяць хлабазагатоўкі.

За 2-ю дэкаду Белкаапсаюзам загатоўлена 300 тон розных хлебапрадуктаў і 800 тон атрымана ад намольнага збору.

Усяго з 1-га па 20-га кастрычніка загатоўлена 2.580 тон розных хлебапрадуктаў.

Пасьпешна праходзяць загатоўкі лёсасемені. Усяго з 1-га па 20-га кастрычніка загатоўлена Белкаапсаюзам 1.395 тон лёсасемені, што складае 130,4 проц. заданьня на кастрычнік.

Да арганізацыі бюро па экспарту.

Пры Наркамгандлі БССР мяркуецца арганізаваць інфармацыйнае бюро па экспарту. Гэтае бюро будзе інфармаваць усе экспартныя арганізацыі аб попыт і аб кан'юнктуры заграничных рынкаў. Мяркуецца таксама выдаваць спэцыяльны штотыднёвы бюлетэнь.

Пашырэньне завочных вучэбных устаноў.

Нар. Кам. Асьветы БССР у бягучым навучальным годзе пастанавіў пашырыць сетку завочных вучэбных устаноў. Завочнае навучаньне мае быць уведзена пры Віцебскім электрамаханічным тэхнікуме, Менскім рабфаку, Віцебскім кааперацыйным тэхнікуме і пры адным з сельска-гаспадарчых тэхнікумаў.

Забясьпечаньне кааперацыі кіно-апаратамі.

Белкаапсаюз увяў курс на забясьпечаньне кінатаварыствам, якія існуюць пры вясковай спажывецкай кааперацыі, кіноапаратурай в усімі прыладамі. Кіно-апараты адпускаюцца в поўным камплектам розных прыладаў у крэдыт на 30 месяцаў. Кошт апарату 700 руб.; з месц ужо паступіў попыт на 9 кіно-апаратаў.

Цікавая гістарычная знаходка.

Пры разборы пляпкаў і праектаў трамваю дарскіх часоў знойдзен дакумэнт і шэраг фатаграфічных здымкаў з часоў польскага паўстаньня 1831 году. Дакумэнт прадстаўляе в сабе распараджаньне аб канфіскацыі маемасьці шэрагу паўстанцаў. Дакумэнт і фатаграфічныя здымкі перададзены ў Менскі музэй рэвалюцыі.

Менскі дзень.

— 3-ці ўсебеларускі зьезд вучастковых дактароў з удзелам прадстаўнікоў аховы здароўя і грамадзкіх арганізацый пастаноўлена склікаць на 6-га сакавіка 1929 г.

На зьезьдзе будуць заслуханы дакледы аб культурнай рэвалюцыі і аховы здароўя, будаўніцтве аховы здароўя за апошнія 2 гады і задачы на бліжэйшыя 5 год.

— 50 прапілямацый 1906 г. перадаў упаўнаважаны Нар. Кам. Замежных Спраў СССР пры ўрадзе БССР тав. Ульянаў Музэю Рэвалюцыі.

Апрача гэтага, ім перададзены некаторыя каштоўныя экспанаты.

Разьмеркаваньне лесасечнага фонду.

На апошнім пасяджэньні Эканомнарады было зацьверджана разьмеркаваньне лесасечнага фонду на 1928-29 год.

Водлуг плану будаўнічай драўніны будзе адпушчана насельніцтву 544.000 куб. мэтраў, Лесбалу 760.000 к. мэтр., Дзьвінаалесу 102.000 к. м., МБВ чыгунцы 173000 к. м., Заходн. чыгунцы 73.000 к. м., Белжылсаюзу—50.000 к. м. Адпушчана таксама драўніна Лесбалу і інш. арганізацыям.

Дэмабілізаваныя—на працу ў савгасы.

Нар. Кам. Працы БССР сумесна з Белсельтрэстам дадзена распараджэньне ўсім акруговым упаўнаважаным Белсельтрэсту разьмясьціць 50 чал. чырвонаармейцаў і начскладу.

Гэтыя дэмабілізаваныя будуць накіраваны на працу ў савецкія гаспадаркі.

Антырэлігійнае выхаваньне ў школе.

Наркамасьветы пастанавіў у праграмы ўсіх навучальных устаноў увесьці элементы антырэлігійнай прапаганды. Навукова Мэтадалёгічны Камітэт НКА зараз распрацоўвае гэтае пытаньне і ў бліжэйшым часе накіруе апрацаваныя матар'ялы на месцы.

Культурнае абслугоўваньне пайшчыкаў.

На бягучы гаспадарчы год Менскі Цэрабкоп вызначыў на культурна-бытавое абслугоўваньне пайшчыкаў 20000 руб. Ужо працуе школа для працаўнікоў крам на 80 чал.

У бліжэйшы час будзе адчынена школа для кааперацыйнага актыву на 45 чал., гурток кройкі і шыцьця і 2 лікпункты.

Справачны аддзел.

КАТЫРОЎКА ПАЗЫК НА 1-XI-1928 г.

Абл. 1 дзярж. паз. —прад. 4—81,5, куп. 4—79,5

Абл. 2 дзярж. паз.—прад. 5—18, куп. 5—16.

Абл. 3 скл. паз.—прад. 5—0,4, куп. 5—0,2.

Абл. 10 пр. паз. 27 году—прад. 25,46,5, куп. 25—36,5

Абл. дзярж. паз. 26 г. — прад. 122,75, куп. 120,75.

Абл. 12 пр. дзярж. паз.—прад. 105—05, куп. 105—00.

Абл. 6 проц. паз. індустр.—прад. 25—20, куп. 25,—10.

Абл. 2 паз. інд. в % прад. 25,10, куп. 25
» » » бяз % прад. 25,10, куп. 25

Апавяшчэньні.

ЛІТАРАТУРНЫ ДЫСПУТ.

Сёньня, 1-га лістапада, у Клюбе Карла Маркса адбудзецца сялікі грамадзкі ЛІТДЫСПУТ на тэму—«ЧАГО МЫ ЧАКАЕМ АД НАШАГА ПІСЬМЕНЬНІКА?»

У дыспуце прымаюць удзел рабочыя чытачы, працаўнікі бібліятэк, навуковыя і літаратурныя працаўнікі.

Пачатак а 7-й гадзіне. Уваход па білетах.

Менскае акруговае т-ва краязнаўства.

2-га лістапада а 6-й гадз. увеч. у канцэлярыі т-ва (Ракаўская, 21) адбудзецца пасяджэньне праўленьня акр. т-ва краязнаўства.

Парадак дня:

1. Заслухоўв. плянаў працы секцыі т-ва. Дакладч.: т. Жураўскі, Даўгала, Пісарчык і Александраў.
2. Аб чарговай працы т-ва і выданьні зборнікаў (дакладч. т. Шапялевіч і т. Сёуруп).
3. Бягучыя справы.

Запрашаюцца сябры праўленьня і ўсе жадаючыя.

ДОМ АСЬВЕТЫ.

— Сёньня, 1-XI кіно «Цёмныя сілы».

Пачатак а 7 з палов г. і 9 з палов. г. увечары.

Пятніца 2-XI а 6 гадз. увеч. арганізацыйны сход усіх завісаўшыхся ў музычны гуртон.

Чацьвер, 1-XI а 7 гадз. увеч. сход усіх завісаўшыхся ў пераміўны гурток.

КЛЮБ НАВУК. ПРАЦАЎН.

Пятніца 2 XI а 9 гадз. увеч. першае заняткі гуртка па вывучэньню франц. мовы.

Субота 3-XI урачысты вечар прысьвечаны кастрычнікавым сьвятам. Пачатак а 8 з палов. гадзін увеч.

ПЭДГАБІНЭТ.

Сёньня, 1 лістапада, а 7 гадз. увечары адбудзецца сход загадчыкаў дэмігадовых і чатырохгадовых школ г. Менску.

Прысутнасьць загадчыкаў і іх намесьнікаў абавязкова.

ПАРТГАБІНЭТ.

— У чацьвер, 1-га лістапада ў 7 гадзін вечара адбудзецца нарада кіраўнікоў дэлегацкіх сходаў.

Яўка кіраўнікоў абавязкова.

— У суботу, 3-га лістапада, а 7 гадзіне ўвечары ў памяшканьні партгабінэту адбудзецца кансультацыя для дакладчыкаў на працарыёмствах (да пастрычніканых сьвят) на тэму: „Аб выніках самакрытыкі".

Яўка ўсіх вылучаных дакладчыкаў абавязкова.

— З першага лістапада г, г. у партгабінэце праводзіцца кансультацыя па матэматыцы.

Кансультацыя праводзіцца 3 разы ў тыдзень—у чацьвер і суботу з 6 да 8 гадзін увечары і ў сераду з 8 да 10 гадзін раніцы.

Кансультацыю могуць атрымаць усе сябры партыі, якія займаюцца ў сыстэме партыйнай асьветы, а таксама тыя, што займаюцца самаадукацыяй.

Пра збор страхавых плацяжоў забылі.

Водлуг апошніх вестак, збор акладных страхавых плацяжоў у большасьці райёнаў БССР яшчэ не пачаўся. Не спагнаюцца таксама і нядоімкі па гэтых плацяжох за мінулы год. За першую палову кастрычніка страхавых плацяжоў і нядоімкі паступіла ў Магілёўскай акрузе 5603 руб., у Гомельскай—4896 руб., а ў Полацкай—усяго толькі 1141 руб. На лепш стаіць справа і па іншых округах БССР.

Між тым страхавыя плацяжы сёлета павінны былі-б паступаць куды лепш мінулагодняга, бо льготны фонд для бяднякага насельніцтва в 521933 р. у 1927-28 г. павялічыўся больш чым на 25 проц. і складае ў бягучым годзе досыць буйную суму—676487 рублёў. Зразумела, што гэты льготны фонд дазволіў вызваліць ад узносу страхавых плацяжоў усіх, для каго ён вызначаўся. Такім чынам, страхавыя плацяжы засталіся толькі за большменш заможнай часткай сялянства, якое мае ўсе магчымасьці своечасова аплаціць свае аклады.

Чаму-ж мы навіраем слабое паступленьне страхавых плацяжоў?

Кепскае паступленьне тлумачыцца тым, што акруговыя і райённыя выканаўчыя камітэты не зварачваюць належнай увагі на арганізацыю збору плацяжоў. Між тым урад своечасова даў дырэктывы, каб пытаньню збору акладных страхавых плацяжоў у працы акруговых і нізавых савецкіх органаў была адведзена належная ўвага.

Акрвыканкомы і райвыканкомы павінны памятаць, што тэрміны збору страхавых плацяжоў карацей, чым летась. Вось чаму неабходна паставіць на месцах справу так, каб тэмп паступленьня страхавых плацяжоў быў значна ўзмоцнен. Гэта неабходна яшчэ і таму, каб пасьля скончэньня тэрміну ня прыходзілася ўжываць супроць страхавальнікаў мер прымусовага парадку, а сялянству не пераплачваць грошай на пені і штрафы.

У нас набліжаецца кампанія перавыбараў саветаў, у часе якой павінна быць зьвернута ўвага нашых райвыканкомаў і сельсаветаў на тое, каб ня быў пасланблен тэмп паступленьня страхавых плацяжоў.

Райвыканкомам трэба прадугледзець скарыстан льготны фонд, пашырыць ці скарыстан льготны фонд, пашырыць ці скарыстаць льготны фонд, перагледзець спісы бяднякоў і былых чырвоных партызан, ад правільнага і своечасовага карыстаньня льготнага фонду залежыць своечасовае паступленьне страхавых плацяжоў.

Мясцовым працаўнікам і сельсаветам трэба памятаць, што, з прычыны ўвядзеньня новых відаў страхаваньня і павялічэньня адказнасьці Дзяржстраху па страхаваньню будынкаў ад агню, сума налічаных страхавых плацяжоў сёлета значна большая, чым у леташнім годзе, калі зараз ня будуць прыняты ўсе меры да ўзмацненьня працы па збору плацяжоў, дык далей будзе больш цяжкасьцей.

Трэба прыняць усе меры да таго, каб акладныя страхавыя плацяжы сабраць у вызначаны ўрадам тэрмін.

В. З.

СУД.

Спэц Лазараў.

Праўленьне Капыльскага сважывецкага таварыства доўгі час шукала спэца прыказчыка на продажы віна, бакалеі і мануфактуры. Вядома, у мястэчку спэца знайсьці было цяжка і прыказчыкам быў прызначан ня спэц, і справа ішла вельмі добра—крама ганялвала здавальняюча, растрат ня было.

Праз некаторы час, калі спажывецкае таварыства разгарнула работу і пачало здавальняць таварамі свае аддзяленьні, на пасаду загадчыка складу і старэйшага прыказчыка быў прызначан прыехаўшы з Воршы спэц—Ізраіль Саламонаў Лазараў.

З дню паступленьня Лазарава на пасаду пашлі іншыя парадкі. Калі прыяжджалі з вёсак прыказчыкі адзяленьняў за таварамі—Лазараў з месца ня рухаўся, аддаваў ключы ад складу і казаў: вось ключ ад складу, бярэце даражэнькія, налівайце што трэба, толькі калі ласка, запішыце ў кніжку, што атрымалі, я на склад не пайду, няма часу.

—Душа, а не загадчык,—казалі прыказчыкі, бяры, рабі што хочам.

Так хадзілі, бралі, накладалі на вазы тавары і ад'яжджалі.

Сам Лазараў пасьля гандлёвага дня ніякіх падрахункаў на складу і краме не рабіў, браў у кішэні адзін, другі чырвонец і накіроўваўся гуляць у карты.

Праз год рэвізійная камісія вытварыла падзік крамы і складу, якімі кіраваў Лазараў, і выявіла недалік па краме і па складу —1165 р. 71 к.

На судзе Лазараў запеў зусім іншую песьню. ён рукамі і нагамі адмахваўся ад нядбайства і імкнуўся даказаць суду, што недалік атрымаўся затым, што ён давяраўся прыказчыкам і што сам не спэцыяліст у гандлёвай справе.

Менскі акруговы суд прыгаварыў: Ізраіля Саламонава Лазараза на адзін год і 6 месяцаў зьняволеньня з суровым адмежаваньнем і спагнаньнем з яго на карысьць таварыства 1165 р. 71 кап.

Н.

СУДОВАЯ ХРОНІКА.

Справа сясьцёр дзіцячай клінікі.

Па пратэсту акруговага пракурора, акрсуд перагледзеў справу сясьцёр дзіцячай клінікі і прыгаварыў Сідэсэр Марыю Кірлаўну і Хмару Філіпаўну Іванову на восем месяцаў зьняволеньня; Маслоўскую Эмілію і Жылінскую Алену на пяць месяцаў зьняволеньня, Сабалеўскую Зосю на тры месяцы, але прымаючы пад увагу нізкі культурны ўзровень Сабалеўскай і нялады ўзрост Жылінскай, вызначаную меру сацыяльнай абароны Жылінскай замяніў умоўным зьняволеньнем з выпытаньм тэрмінам на працягу трох год, а Сабалеўскай—грамадзкім парыцаньнем. Лудзіч на суду апраўдана.

Адначасова суд зьвярнуў увагу адміністрацыі клінікі на несвоечасовае разгляданьне супроць пазуленьня антысэміцызму, які быў выкрыт толькі праз друк, аб чым пастанавіў давесьці да ведама аддзел аховы здароўя.

Нядбайнасьць касіра дзяржбанку.

13-га сакавіка 1928 году касір Барысаўскага аддзяленьня Дзяржбанку Хрысьціян Барс пры выдаче в касы грошай перадаў невядома каму 2000 р.

Выязная сэсія Менскага акруговага суду на пасяджэньні 108 арт. КК прыгаварыла Хрысьціяна Барса на 1 год умоўнага зьняволеньня з спагнаньнем з яго на карысьць гарантыйнага страхаваньня Белдзяржстраху 2000 руб.

Рознае.

РЭДКАЯ КАТАСТРОФА.

22 верасьня г. г. у Літве здарылася рэдкая катастрофа вайсковага самалёту. На вышыні 150 мэтраў загарэўся рухавік самалёту. Абодвы лятуны, кап. Пясецкі і пар. Шымкус выйшлі з кабіны і сталі на крыльлях самалёту. Калі самалёт пачаў спадаць, кап. Пясецкі ўтрымаў яго ў паветнай пазіцыі, дакуючы чаму сіла спаданьня значна зьменшылася і абодвы лятуны ўратаваліся.

НАЛЁТ ВЕРАБ'ЁЎ НА ЧЫЛІ.

У 1916 г. прыбыў на адным з параходаў да Вальпарайзо адзін італьянскі эмігрант, прывёзшы з сабою ў клетцы 20 пар вераб'ёў, у надзеі прадаць іх аматарам птушак у Чылі, дзе да таго часу вераб'ёў ня было. Аднак, чылійская адміністрацыя загадала эмігранту заплаціць вялікае мыта. Тады разгневаны італьянскі эмігрант адчыніў клетку і выпусьціў вераб'ёў на волю.

Рэзультат быў нечаканы. Вераб'ям так спадабаўся клімат паўдзённай Чылі і столькі яны знайшлі там ежы, што праз некалькі гадоў цэлыя хмары іх запрудзілі палі, робячы вялікія шкоды пасевам і выпіраючы ўсё далей на поўдзень мясцовых птушкі тэй самай вялічыні, як шэрсак, дзюка, шынсоль і жыльгуэро.

Цяпер урад Чылі змушан прадпрыняць патрэбныя сродкі проці вераб'ёў, якія сталі сапраўдным нагроваем для Чылі.

ГОРАД, ЯКІ ГАРЫЦЬ КАЛЯ 45 ГОД.

У Амэрыцы, у штаце Огіо знаходзіцца горад Стратэсвіл, які абкружан тысячай маленькіх вульканчыкаў, яны ўтвараюць навокал каменнае поле і не даюць магчымасьці жыць прыгожым вёскам. Калі падыдзе на адзін з такіх кратэраў, можна ўбачыць на дно вульканы высокія языкі агню.

Жыкары гэтай мясцовасьці ўжо прывычаіліся да небясьпек і спакойна дзелі будуюць дамы на зямлі, пад якой бушуе агонь.

З 1884 г. далучылася новая крыніца агню, створаная ўжо людзкімі рукамі.

У Огіо ў 1884 г. выбухла вялікая забастоўка шахцёраў, і яны падвялілі шахту „Плёмбэр". Спачатку гаразд толькі адзін пласт вугалю, але гэтага тады не заўважылі.

Толькі, калі было зьвішчана 50 мэтраў каменнавугольнага пласту, заб